КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №17 (145)
◂ 15 МАЯ ◂ 2009 г.

# Новы Час



**ЛОНДАН— МІНСК— БАБРУЙСК, ЗНОЎ ЛОНДАН**

Стар. 14

**ЕГУ ПАМІЖ МІНУЛЫМ І БУДУЧЫМ**

А вось вывучыць еўрапейскія мовы, атрымаць еўрапейскую адукацыю, досвед, а пасля вярнуцца ў Беларусь і працаваць тут на карысць сабе і краіне пагадзіліся ўсяго толькі некалькі чалавек...

Стар. 6

**ЗА БЛОГ — У ТУРМУ**

Ніжняя палата казахскага парламента ўсё ж прыняла папраўкі да закону аб СМІ...

Стар. 13

**ПАМЯЦІ ВІТАЛЯ ЦВІРКІ**

Стар. 15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**Станіслаў Манюшка — паляк, ліцвін…**

**Нарыс Аляксея Хадыкі**

▸ **АД ПЕРШАЙ АСОБЫ**

# Ханс-Ёхан Шмідт: ДЗЕЙНІЧАЦЬ У АГУЛЬНЫМ ПОЛІ АКТЫЎНАСЦІ

**Інтэрв'ю Ханса-Ёхана Шмідта, кіраўніка офіса АБСЕ ў Мінску шэф-рэдактару «Новага часу» Аляксею Каралю.**



Фота Юрыя Дзядзінкіна

***— Спадар пасол, тэма працы місіі АБСЕ ў Беларусі набывае асаблівую актуальнасць у сувязі з уключэннем Беларусі ў праграму «Усходняе партнёрства». Відавочная тут і роля місіі АБСЕ ў Мінску, якая працуе з верасня 1997 года (спачатку як Кантрольна-назіральная група АБСЕ, а з 2003 года — пад назвай Офіс АБСЕ ў Беларусі). Працуе ў няпростых умовах. 2001–2002 гады адзначаныя згортваннем практычна ўсіх праектаў АБСЕ ў Беларусі, фактычным закрыццём місіі. Пасля ад'езду кіраўніка місіі Ханса-Георга Віка, новы яе кіраўнік — Эберхард Хайкен — атрымаў магчымасць выконваць свае абавязкі толькі ў пачатку 2003 года. Вы ўзначальваеце місію ў Беларусі крыху больш за год. Якімі Вы бачыце месца і ролю місіі АБСЕ ў Беларусі, яе магчымасці, формы і метады дзейнасці, узаемадзеянне з рознымі палітычнымі і грамадскімі сіламі?***

— Мне ўзгадваецца гутарка з міністрам замежных спраў Беларусі ў снежні 2007 года, падчас майго нефармальнага прадстаўлення. Размова датычыла і згаданага Вамі перыяду. Тады, пасля закрыцця офіса ў 2002 годзе, было вельмі няпроста даць АБСЕ яшчэ адну магчымасць аднаўлення дзейнасці. Падчас перамоў было ўзгоднена, як аформіць новы мандат. На мой погляд, ён не надта адрозніваецца ад мандата, па якім працаваў спадар Вік. Мы маем магчымасць працаваць па двух накірунках — чалавечым або палітыка-эканамічным. Мы можам таксама весці маніторынг.

Калі я прыехаў сюды (а здарылася гэта 4 лютага 2008 года), сітуацыя адрознівалася ад сённяшняй, існавала пэўная напружанасць. Былі вызвалены некалькі вязняў, прызнаных міжнароднымі праваабарончымі арганізацыямі палітычнымі зняволенымі, але не быў вызвалены Казулін. Гэта справакавала жорсткую рэакцыю з боку некаторых краін. І гэта ўсё, на маю думку, адмоўна адбілася на нашай працы.

Думаю, працоўны клімат стаў змяняцца да лепшага з моманту, калі было прынята рашэнне пра допуск каманды БДІПЧ у Беларусь з місіяй назірання за выбарамі. Беларускія ўлады вельмі канструктыўна распрацавалі мандат місіі, прычым без абмежавання яе колькасці. Пасля выбараў БДІПЧ апублікавала сваё заключэнне, што дало магчымасць наладзіць экспертныя дыскусіі. Мы дапамагалі таксама рыхтаваць сустрэчы, якія адбыліся ў пачатку гэтага года, паміж экспертамі АБСЕ і Беларусі; кансультацыі былі накіраваныя на распрацоўку прапаноў аб зменах Выбарчага кодэкса па рэкамендацыях БДІПЧ. У гэты раз, у адрозненне ад трох папярэдніх, улады паведамілі пра сваю гатоўнасці да станоўчых адказаў на гэтыя рэкамендацыі. Паглядзім.

***— Але ж выбары не былі ні свабоднымі, ні справядлівымі. І ацэнку ім БДІПЧ дало даволі жорсткую. Тым не менш, дыялог быў працягнуты. Якім чынам непразрыстасць выбараў і працяг дыялога спалучаюцца ў разуменні заходніх палітыкаў?***

— З боку Захаду існуюць пэўныя спадзяванні. Пасля выбараў Еўрасаюз прыняў рашэнне пачаць кансультатыўны палітычны дыялог. Беларускі бок адказаў, што ён станоўча ўспрымае прапановы БДІПЧ і гатовы арганізоўваць «круглыя сталы» з удзелам прадстаўнікоў як дзяржаўнага, так недзяржаўнага сектараў, прысвечаныя праблемам СМІ. Гэтыя сігналы справакавалі чаканні Захаду. Паглядзім, якія канкрэтныя крокі зробіць беларускі бок у найбліжэйшай будучыні, каб пацвердзіць гэтыя спадзяванні.

***— Зараз мы назіраем другую спробу дыялога. Першая адбылася ў 1999 годзе па ініцыятыве спадара Віка. І была рэзка абарваная беларускімі ўладамі, пасля надышоў доўгі перыяд абвастрэння адносін з Захадам. Наколькі вялікая верагоднасць таго, што і гэтую спробу чакае падобны фінал?***

— Цяжка прадказаць будучыню. Я думаю, што сёння палітычнае кіраўніцтва вашай краіны зацікаўлена ў развіцці і паляпшэнні адносін не толькі з Расіяй, але і з Захадам. Па розных прычынах. Думаю, не варта папракаць Захад, нібыта яго зацікаўленасць у дыялогу тлумачыцца выключна камерцыйнымі прычынамі. З досведу папярэдніх гадоў заходнія палітыкі зрабілі выснову пра тое, што ізаляцыя не прыносіць жаданых вынікаў. І лепш знайсці шлях, які дазваляе абодвум партнёрам дзейнічаць у агульным рэчышчы актыўнасці, якое прадстаўляе ўзаемныя інтарэсы. У гэтым рэчышчы знаходзяцца і функцыі офіса АБСЕ. Хоць іх значэнне не варта пераацэньваць. Кіраўнік гэтага офіса не павінен рабіцца каталізатарам унутранага палітычнага дыялога — напрыклад, каталізатарам афармлення апазіцыйных сіл. Гэта задача саміх апазіцыйных сіл. Гэта задача Беларусі — знайсці свой палітычны шлях. Гэта задача вашых палітыкаў, грамадзян — знайсці выхад з крызісу. З крызісу эканамічнага. З крызісу, па меркаванні шмат каго, палітычнага. Мы можам быць карысныя ў ролі мадэратара. У стасунках як з грамадствам, з прадстаўнікамі грамадскіх сіл, так і з выканаўчай уладай.

Ёсць і ў краінах — удзельніцах АБСЕ людзі, якія крытыкуюць наш офіс за недастатковую ўвагу да апазіцыі.

Працяг на стар. 4 ▸

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### НАРВІЛІШКІ. ТРЭЦІ МУЗЫЧНЫ ФЭСТ ЗАПРАШАЕ

Чарговы музычны фэст *«Be2gether»* зноў пройдзе ля самай мяжы Літвы і Беларусі з 12 па 14 чэрвеня на тэрыторыі старажытнага замка. Замак знаходзіцца ўсяго ў 50 метрах ад літоўска-беларускай мяжы. Фэст праходзіць пад назвай «Музыка разбурае межы».

Фэст будзе максімальна адкрытым для беларускай публікі. Квіткі на яго з'явяцца ў продажы ў Мінску ўжо ў бліжэйшыя дні. Прысутныя пабачаць некалькі сцэнаў з гуртамі з усяго свету, вялікі намётавы гарадок, безліч забаваў на працягу некалькіх дзён. Асноўныя выступы будуць праходзіць сёлета амаль кругласуткава 12 і 13 чэрвеня. Квіток на ўсе дні ў Беларусі будзе каштаваць 142 тысячы рублёў. Грамадзяне Беларусі, якія набудуць афіцыйны квіток, могуць звярнуцца ў амбасаду Літоўскай Рэспублікі ў Мінску за бясплатнай візай да 8 чэрвеня. Сярод выканаўцаў з сёлетняй праграмы *«Be2gether»*: *«Gogol Bordello»* (ЗША), *«Polarkreis 18»* (Германія), *«Touch and Go»* (Вялікабрытанія) і *«Clawfinger»* (Швецыя), *«Roni Size»* (Вялікабрытанія). Беларусь прадставіць гурт «Ляпіс Трубяцкой».

### ВІЛЕЙСКІ РАЁН. ПАМЯТНЫ ЗНАК ЗЕМЛЯКУ

Неўзабаве ў вёсцы Касута будзе пастаўлены памятны знак у гонар 335-годдзя з дня нараджэння Піліпа Орліка, аўтара першай Канстытуцыі Украіны, паплечніка Мазепы.

Больш за трыста гадоў таму былі агалошаны складзеныя Орлікам «Пакты і Канстытуцыя праў і вольнасцяў Войска Запарожскага», якія гісторыкі назвалі «Канстытуцыя Піліпа Орліка». Праз два гады наш зямляк склаў «Звод правоў Украіны» і «Маніфест да еўрапейскіх урадаў». У гэтых дакументах абвяшчалася поўная незалежнасць Украіны ад польскага і расійскага ўплыву. Пасля 1712 года Піліп Орлік да самай смерці быў у эміграцыі. Яго сын Георгій стаў французскім генералам, сябрам Каралеўскага Савета, атрымаў тытул графа. На Украіне зацверджана прэмія імя Орліка, Дзяржаўны банк выпусціў манету з яго выявай.

Працу над праектам памятнага знака праводзіць Беларускае грамадскае аб'яднанне украінцаў «Варта» і яго Мінскае аддзяленне «Заповіт».

### ГАЛЬШАНЫ. МУЗЕЙ АДНОВЯЦЬ ВЕРНІКІ

Музей у Гальшанах быў не менш знакаміты, чым замак, які апісаў у рамане «Чорны замак Альшанскі» Уладзімір Караткевіч.

Экспазіцыя знаходзілася ў манастырскім комплексе, што быў збудаваны амаль чатыры стагоддзі таму, і ў апошні час належаў Нацыянальнаму мастацкаму музею. Штогод у музеі бывала да 13 тысяч наведвальнікаў. У 1990 годзе касцёл передалі каталікам. Музей працягваў існаваць, бо знаходзіўся ў іншых пабудовах манастыра. Восенню мінулага года памяшканні музея былі прызнаны аварыйнымі і зачынены, супрацоўнікі яго звольнены. Фактычна музей перастаў існаваць. Аднак неўзабаве стала вядома, што іншыя памяшканні манастыра таксама перададзены касцёлу. Адпаведны дакумент падпісаў кіраўнік дзяржавы. Дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Уладзімір Пракапцоў, ведамства якога ў свой час належаў тутэйшы музей, мае надзею, што тут хутка адбудзецца капітальны рамонт, і з экспазіцыяй музея зноў змогуць знаёміцца наведвальнікі.

### КАМЯНЕЦ. «БЕЛАВЕЖСКАЯ ПУШЧА — 600»

«Белавежская пушча — 600». Пад такой назвай распачала вандраванне па сталіцах Еўропы фотавыстава, прысвечаная непаўторнай прыгажосці гэтага кутка Беларусі.

Фотавыстава стартавала ў Расіі. Яе экспазіцыя прадстаўлена ў будынку Дзяржаўнай думы. Выстава мае чатыры раздзелы. Першыя два распавядаюць пра гісторыю пушчы: ад сярэднявечча да XIX стагоддзя. Расійскія дэпутаты маюць магчымасць даведацца пра прыродныя аб'екты пушчы, расліннi і жывёльны свет, водныя рэсурсы. У экспазіцыі распавядаецца пра турыстычны патэнцыял пушчы, у тым ліку пра ўладанні беларускага Дзеда Мароза. Пасля Масквы выстава будзе экспанавацца ў Мінску. Надалей ёй наканавана доўгае падарожжа па Еўропе.

**Падрыхтаваў Язэп Палубятка**

ДЫЯЛОГ

## БЕЛАРУСЬ — ЕЎРОПА. ПЫТАННІ І АДКАЗЫ

*Генадзь КЕСНЕР*

**Пакуль не вызначана дата дыялога паміж афіцыйным Мінскам і Еўрасаюзам па пытаннях выканання правоў чалавека ў Беларусі. Няма пэўнасці і па праблеме цаны візы для беларусаў. Але ёсць яснасць па некаторых канкрэтных праектах беларуска-еўрапейскага супрацоўніцтва. Пра гэта на прэс-канферэнцыі распавёў кіраўнік прадстаўніцтва Еўрапейскай Камісіі ў Беларусі Жазэ Мануэль Пінту Тэйшэйр.**

Сустрэча з журналістамі пасла Еўракамісіі ў Беларусі была прысвечана Дню Еўропы, які на кантыненце адзначаецца 9 мая. У гэты дзень пяць гадоў таму Еўрасаюз пашырыўся адразу на дванаццаць дзяржаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Гэта, па словах дыпламатаў, стала магчымым толькі дзякуючы сур'ёзным палітычным, эканамічным і сацыяльным рэформам у гэтых краінах.

Жазэ Мануэль Пінту Тэйшэйр адзначыў, што пасля прыняцця ў Празе 7 мая праграмы Еўрасаюза «Усходняе партнёрства», у якую ўвайшлі шэсць рэспублік былога СССР, у тым ліку і Беларусь, Еўрасаюз разглядае афіцыйны Мінск у якасці свайго новага партнёра.

Аднак са словаў дыпламата стала зразумела, што ў працэсе супрацоўніцтва паміж ЕС і Беларуссю застаецца шмат пытанняў, хаця некаторыя з іх ужо знаходзяцца на стадыі абмеркавання. Напрыклад, дагэтуль не распачаўся дыялог паміж Беларуссю і Аб'яднанай Еўропай па пытаннях выканання правоў чалавека ў нашай краіне.

Яшчэ адным важным пытаннем, што цікавіла журналістаў, было магчымае прызнанне афіцыйным Мінскам незалежнасці мяцежных грузінскіх тэрыторый — Абхазіі і Паўднёвай Асеціі і верагодны ўплыў такога рашэння на еўраінтэграцыю Беларусі.

«Вы дакладна ведаеце пазіцыю Еўрасаюза: ён не прызнае і не збіраецца прызнаваць незалежнасць Абхазіі і Паўднёвай Асеціі. Але гэта пытанне не з'яўляецца часткай дыялога паміж Беларуссю і Еўрасаюзам і не абумоўлівае гэты працэс, які, да таго ж, не з'яўляецца еўраінтэграцыяй. Прызнаваць або не прызнаваць гэтыя ўтварэнні — мусіць быць рашэннем беларускага кіраўніцтва і беларускага народа, але мы разглядаем як станоўчы той факт, што Беларусь пакуль не прызнала іх незалежнасць», — заявіў спадар Тэйшэйр.

Кіраўнік прадстаўніцтва Еўракамісіі не змог канкрэтна адказаць на пытанне, ці будзе і калі зменшана цана візы ў краіны ЕС для грамадзян Беларусі. Па словах дыпламата, гэта даволі складанае пытанне, якое вымагае часу і высілкаў, але выказаў спадзяванне, што праблема будзе вырашана, прычым у не самай аддаленай перспектыве.

Што да канкрэтных праектаў, то Жазэ Мануэль Пінту Тэйшэйр паведаміў, што ЕС выдаткуе Беларусі 8,5 мільёна еўра на стварэнне спецыяльнай лабараторыі, якая мусіць кантраляваць якасць прадуктаў харчавання, бо ёсць перспектывы павелічэння паставак беларускай харчовай прадукцыі ў краіны Еўрасаюза.

СПРАВА

## ВЯЧОРКА ЗВЕРНЕЦЦА ДА КАМАНДЗІРА

**Прымусова прызваны ў армію актывіст моладзевага дэмакратычнага руху Франак Вячорка мае намер звярнуцца да камандзіра батальёна з просьбай накіраваць яго на медыцынскую экспертызу. Пра гэта ён паведаміў БелаПАН.**

«Я адчуваю пастаянную слабасць. Пару дзён таму мяне вазілі ў паліклініку ў Мазыр. Ціск быў 170 на 110. Нават доктар, якая вымярала мне ціск, была ўражана: якім чынам з такім ціскам я магу служыць у арміі. Яна выпісала мне яшчэ адзін прэпарат, каб адчуваць сябе нармальна. Я ўжо прымаю пяць прэпаратаў у дзень. Атрымліваецца, што мяне забралі ў армію, каб там я сядзеў на таблетках. Мяне нават з нарадаў перыядычна здымаюць менавіта па стане здароўя», — сказаў Вячорка.

Франак мае намер звярнуцца да камандзіра батальёна для праходжання ваеннай медэкспертызы. «Можа, мяне камісуюць», — мяркуе ён.

Нагадаем, у ліпені 2008 года медкамісія ваенкамата Савецкага раёна Мінска прызнала Франака Вячорку, лідэра моладзевай арганізацыі Партыі БНФ «Моладзь БНФ», непрыгодным да вайсковай службы па стане здароўя. Абласная медкамісія паставіла гэта рашэнне пад сумненне. Пасля абследавання ў ваенным шпіталі маладому чалавеку была дадзена адтэрміноўка ад службы да сакавіка 2009 года. Аднак 16 студзеня ваенкамат Савецкага раёна Мінска прызнаў моладзевага актывіста прыгодным да вайсковай службы. Суд гэтага ж раёна, дзе было абскарджана рашэнне ваенкамата, 23 студзеня пакінуў яго ў сіле. Рашэнне суда прымалася ў адсутнасці Франака і яго адваката.

Цяпер Вячорка служыць у Мазыры ў воінскай часці № 48694 супрацьпаветранай абароны.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## ЧАРГОВЫ ВАНДАЛІЗМ

**Распачата крымінальная справа па факце апаганьвання ў Брэсце помніка вязням гета.**

Як паведамілі ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Брэсцкага аблвыканкама, справа па частцы 1 артыкула 346 Крымінальнага кодэкса (апаганьванне гісторыка-культурных каштоўнасцяў) распачата 12 мая аддзяленнем папярэдняга расследавання Ленінскага РАУС Брэста.

У ноч з 9 на 10 мая каля помніка вязням гета, што ўстаноўлены на перакрыжаванні вуліц Дзяржынскага і Куйбышава, былі спалены вянкі і кветкі. Сам помнік пачарнеў ад курodыму. Пра здарэнне паведамілі ў праваахоўныя органы, Брэсцкі гарвыканкам і інфармацыйна-культурны цэнтр пасольства Ізраіля ў Беларусі старшыня брэсцкай яўрэйскай абшчыны Барыс Брук.

Як адзначае Б. Брук, акты вандалізму фіксуюцца каля гэтага помніка апошнія сем гадоў. Адзін з іх быў учынены 9 мая 2007 года. Вінаватыя ў іх так і не былі ўстаноўленыя.

Помнік вязням гета быў адкрыты ў 1992 годзе ў памяць пра 34 тысячы жыхароў Брэста, якіх фашысты расстралялі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

**БелаПАН**

СУД

## «ДОМ НА СКАЛЕ» АШТРАФАВАЛІ

**Суддзя Кастрычніцкага раёна Магілёва Ірына Цяплова 11 мая аштрафавала на чатыры базавыя велічыні індывідуальнага прадпрымальніка, сябра міжнароднай грамадскай арганізацыі «Дом на скале» Людмілу Бацюк за незаконную рэлігійную дзейнасць.**

Людміла Бацюк лічыць такое рашэнне незаконным, паколькі яна як вернік пазбаўлецца права аказання маральнай дапамогі людзям, якія пакутуюць ад алкагольнай і наркатычнай залежнасці.

Паводле яе слоў, рашэнне суда супярэчыць словам Аляксандра Лукашэнкі ў пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу ад 23 красавіка гэтага года: «Мы разлічваем на дапамогу і падтрымку ўсіх канфесій ва ўмацаванні сям'і і выхаванні маладога пакалення, у сферы дабрачыннасці, сацыяльнага служэння, прадухілення п'янства, гвалту і духоўнай дэградацыі».

Бацюк мае намер абскардзіць у Магілёўскім абласным судзе рашэнне І. Цяпловай. Акрамя таго, яна збіраецца абскардзіць у органах юстыцыі дзеянне суддзі, якая, паводле яе слоў, прыняла рашэнне па справе, не пакідаючы залу судовых пасяджэнняў.

Юрыст Дзіна Шаўцова адзначыла, што суддзя І. Цяплова прыняла сваё рашэнне на падставе часткі 1 артыкула 9.9 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях. Аднак, як лічыць юрыст, ужыванне мер адміністрацыйнай адказнасці, прадугледжаных часткай 1 артыкула 9.9 КоАП за дзейнасць, звязаную з распаўсюджваннем рэлігійных перакананняў, супярэчыць артыкулу 31 Канстытуцыі, які гарантуе грамадзянам права на свабоду сумлення і рэлігіі, а таксама артыкулу 18 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах.

Мэтай дзейнасці арганізацыі «Дом на скале» з'яўляецца «аказанне сацыяльных паслуг насельніцтву, асвета моладзі ў галіне сексуальных і шлюбных адносін, супрацьдзеянні пазашлюбным і дашлюбным сувязям».

**БелаПАН**

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# НЕКАЛЬКІ ПАРАЗАЎ І АДЗІНАЯ ПЕРАМОГА

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Што ні кажы, а мінулы тыдзень выдаўся для Беларусі вельмі няўдалым. Мы шмат прайгралі ўсяго толькі за некалькі дзён. Заўважым, што гэта адбылося пры поўнай адсутнасці нейкіх сенсацый — нашы пройгрышы былі прадказальнымі.**


Photo.ByMedia.Net

Па-першае, беларускі выканаўца Пётр Ялфімаў не трапіў у фінал міжнароднага конкурсу песні «Еўрабачанне–2009», які праходзіць у Маскве. Ялфімаў з кампазіцыяй «Eyes That Never Lie» выступаў у першым паўфінале ў ноч на 13 мая. Занятае ім месца будзе вядома пасля фіналу 16 мая.

За ўсю гісторыю ўдзелу ў конкурсе (з 2004 года) прадстаўніку Беларусі толькі адзін раз удавалася выйсці ў фінал. У 2007 годзе Дзмітрый Калдун заняў шостае месца сярод усіх удзельнікаў.

Пэўна, гэты выступ будзе самым скандальным за ўсю гісторыю «Еўрабачання». Спачатку Ялфімаву не спадабаўся нумар, з якім яму прапанавалі выступіць. Потым ён узняў скандал наконт грошай на выступ, якія, па яго словах, зніклі невядома куды. А пасля паразы на конкурсе не знайшоў нічога лепшага, як мацюкнуцца перад журналістамі, а ягоны прадзюсер — абвінаваціць у паразе саміх журналістаў. «Спяваў я ах…на! Так і напішыце. Дай бог усім так спяваць», — сказаў у роспачы Пётр. «У вас, у журналістаў, праблема. Вельмі сур'ёзная. Бо вы — дурныя», — патлумачыла Тацяна Касмачова.

Можа, нам трэба выбіраць на Еўрабачанне больш культурных людзей? Можа, таму мы і прайграем рэгулярна?

Не ўзрадавалі нас і эксперты місіі Міжнароднага валютнага фонду (МВФ), якая працавала ў Мінску з 29 красавіка па 13 мая. Згодна з іх высновамі, уплыў эканамічнага крызісу на Беларусь узмацніўся з часу ўзгаднення ў студзені 2009 года праграмы, якую падтрымлівае крэдыт stand-by у памеры 2,46 мільярда долараў ЗША.

«Падчас нашых дыскусій, якія доўжыліся на працягу апошніх двух тыдняў, мы дасягнулі вялікага прагрэсу», — гаворыцца ў заяве кіраўніка місіі Крыса Джарвіса. Асноўная ўвага падчас перамоў, паведаміў ён, была сканцэнтравана «на тым, як рэагаваць на праблемы, з якімі сутыкнулася Беларусь у сувязі з пагаршэннем перспектыў развіцця сусветнай эканомікі».

Па выніках працы ў Мінску місія прадставіць кіраўніцтву МВФ спраздачу, якая будзе абмеркавана Саветам дырэктараў фонду. Пасля гэтага будзе прымацца рашэнне пра выдзяленне Беларусі наступнага траншу крэдыту. Улічваючы арганізацыйныя моманты, гэта адбудзецца не раней за чэрвень.

А нам так шмат казалі, што ў Беларусі крызісу няма і не будзе. Мы не ўсведамлялі, што змагацца за стабільнасць эканомікі трэба не словамі і заклінаннямі, а стварэннем спрыяльных умоў для развіцця, — перш за ўсё, для самастойнага бізнесу грамадзян, якія не толькі ствараюць працоўныя месцы, але і плацяць падаткі. Не прыслухоўваліся. Знішчалі шапікі, падвышаючы беспрацоўе, уводзілі і ўводзім манаполію на гандаль асобнымі відамі тавараў... Карацей, самі сабе ствараем праблемы, у выніку — крызіс.

Паразу таксама пацярпела і частка апазіцыі. 12 мая Міністэрства юстыцыі Беларусі адмовіла ў дзяржаўнай рэгістрацыі партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя» (БХД). Рашэнне прынята па выніках вывучэння пададзеных БХД дакументаў, якія, як сцвярджае Мінюст, утрымліваюць недакладныя звесткі.

У прыватнасці, у ходзе вывучэння дакументаў, пададзеных для рэгістрацыі, устаноўлена, што ў спісе заснавальнікаў БХД нібыта названы асобы, якія не бралі ўдзел у правядзенні сходаў па вылучэнні дэлегатаў на ўстаноўчы з'езд партыі і ў працы самога з'езда. Мінюст лічыць, што паўнамоцтвы прысутных на ўстаноўчым з'ездзе БХД дэлегатаў мандатнай камісіяй належным чынам правераны не былі, у сувязі з чым на з'ездзе прысутнічалі тыя асобы, якія дэлегатамі не абіраліся. Акрамя таго, адзначае Мінюст, устаноўлены факты «ўвядзення ў зман асоб, чые подпісы ёсць у спісе заснавальнікаў партыі БХД, адносна таго, пад якім дакументам яны падпісваюцца». Пададзеныя партыяй дакументы ўтрымліваюць таксама іншыя парушэнні.

Нерэгістрацыя таксама была прадказальнай. Адзін з сустрашыняў БХД Павел Севярынец заявіў, што ён «не сумняваўся ў тым, што ў рэгістрацыі БХД будзе адмоўлена». «Цяпер адзін з дзяржаўных тэлеканалаў здымае сюжэт пра нашу партыю. Пад націскам мясцовых уладаў нашых актывістаў прымушаюць гаварыць на камеру, што яны не ўдзельнічалі ва ўстаноўчым з'ездзе. Гэта робіцца для таго, каб апраўдаць адмову ў рэгістрацыі БХД», — сказаў палітык. Паводле яго слоў, «улады баяцца легалізацыі структур партыі, якая працуе з установамі адукацыі, царквой». Севярынец падкрэсліў: якім бы ні было рашэнне Мінюста, партыя працягне працу.

І адзіная перамога Беларусі за тыдзень — чэмпіянат свету па хакеі 2014 года пройдзе ў Беларусі. Такое рашэнне прынята 8 мая ў Берне (Швейцарыя) на штогадовым кангрэсе Міжнароднай федэрацыі хакея (ІІХФ). Са 105 дэлегатаў кангрэса 75 аддалі голас Беларусі.

На права правядзення сусветнага першынства прэтэндавалі чатыры краіны: Беларусь, Венгрыя, Латвія і Украіна. Пяты кандыдат — Чэхія — раней выйшла з барацьбы.

Беларусь плануе прыняць сусветнае першынство на «Мінск-Арэне» ўмяшчальнасцю 15 тысяч гледачоў, якая ўвойдзе ў строй гэтай восенню, і на арэне ў сталічным мікраараёне Чыжоўка (8 тысяч гледачоў) — яе ўзвядзенне толькі пачалося.

Як паведаміў у інтэрв'ю *«Прессболу»* Уладзімір Навумаў, плануецца, што на працягу трох тыдняў мая 2014 года ўезд у Беларусь будзе бязвізавым.

Галоўнае, каб у гэты складаны крызісны перыяд мы ўсё ж здолелі дабудаваць і «Мінск-Арэну» і арэну ў Чыжоўцы. На ўсё гэта трэба грошы, а іх дастаць у крызісны перыяд неверагодна цяжка. Так што будзем спадзявацца на лепшае і на рэспубліканскія суботнікі. Не дарма ж Аляксандр Лукашэнка менавіта на будоўлю «Мінск-Арэны» амаль у першы раз вывеў свайго сына Колю.

Дый сам Лукашэнка ў баку не застаецца. Па ягоных словах, гэта вялікая эканамічная перамога. «Да нас прыедуць дзесяткі тысяч турыстаў з усіх краін свету. Гэта не бедныя людзі, будзем гаварыць адкрыта, а людзі з дастаткам, і нам трэба сур'ёзна падрыхтавацца да таго, каб прапанаваць гэтым людзям за іх грошы самыя розныя паслугі. Гэта вельмі добры эканамічны штуршок для развіцця не толькі нашага Мінска, але і ўсёй эканомікі», — падкрэсліў прэзідэнт.

Паглядзім, ці збудуцца прагнозы прэзідэнта.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ



### АЛЯКСЕЙ ЯНУКЕВІЧ

Намеснік старшыні партыі БНФ Аляксей Янукевіч публічна абвясціў пра свой намер змяніць на пасадзе кіраўніка Лявона Баршчэўскага. Дагэтуль Аляксей Янукевіч знаходзіўся ў ценю партыйных функцыянераў і на публічнасць асабліва не прэтэндаваў, цяпер жа, відавочна, хоча ўзысці на алімп беларускай палітыкі. «Сітуацыя ў краіне настолькі імкліва мяняецца, што існаваць так, як Фронт існаваў апошнія гады, няма ніякай магчымасці. Важна прыцягнуць у партыю новых людзей з новымі ідэямі. Прыход новай асобы, якая не ідзе на адкіданне франтаўскай спадчыны, а выступае за абнаўленне БНФ, будзе добрым сігналам грамадству», — заявіў у інтэрв'ю газеце «Наша ніва» малады палітык.

Чарговы з'езд партыі БНФ адбудзецца ў верасні гэтага года. Цяперашні старшыня Лявон Баршчэўскі неаднаразова заяўляў пра свой намер сысці з пасады кіраўніка партыі.

### УДЗЕЛЬНІКІ ГАЛАДОЎКІ САЛІДАРНАСЦІ



Photo.ByMedia.Net

Ужо дзесяць дзён доўжыцца галадоўка салідарнасці з ваўкавыскімі прадпрымальнікамі Мікалаем Аўтуховічам, Юрыем Лявонавым і Уладзімірам Асіпенкам, якія знаходзяцца ў следчым ізалятары на Валадарцы. Галадоўнікі-маладафронтаўцы Наста Палажанка, Мікола Дземідзенка, Арцём Дубскі, Яўген Скрабец, Ірына Губская, Ілля Нагорны і Кацярына Салаўёва знаходзяцца ў памяшканні ўправы партыі БНФ. Сваёй акцыяй яны імкнуцца прыцягнуць увагу да сітуацыі з ваўкавыскімі прадпрымальнікамі, а таксама дамагаюцца рэакцыі з боку ўладаў. Нягледзячы на тое, што Мікалай Аўтуховіч заклікаў маладафронтаўцаў спыніць акцыю, яны маюць намер працягваць галадоўку да таго часу, пакуль не будзе вырашана пытанне з ваўкавыскімі вязнямі.

Да ўсяго 14 мая маладафронтаўцы маюць намер правесці «Марш за незалежнасць» ад Кастрычніцкай плошчы да плошчы Незалежнасці. Дата маршу прымеркаваная да дзень, калі нацыянальныя сімвалы Беларусі — герб «Пагоня» і бел-чырвона-белы сцяг — былі зменены на цяперашнія, што засталіся ў спадчыну ад часоў БССР.

### ПАВЕЛ КУР'ЯНОВІЧ

Актывіст «Маладога фронту» Павел Кур'яновіч «патрапіў пад судовую раздачу» за распаўсюд улётак з інфармацыяй пра правядзенне «Маршу за незалежнасць». Актывіста разам з непаўналетняй дзяўчынай Вікай Ладзіс супрацоўнікі міліцыі затрымалі 12 мая ў Мінску на праспекце Незалежнасці. Іх абвінавацілі ў распаўсюджванні ўлётак, хаця юнак сцвярджае, што такім чынам рэалізоўваў сваё права на ўдзел у мітынгах і дэманстрацыях. Віку Ладзіс пасля затрымання адпусцілі, а Павел вымушаны быў пераначаваць за кратамі.

Актывісту пагражаў арышт або штраф за парушэнне правілаў правядзення масавых акцыяў. Адвакат Павел Сапелка непакоіўся, што справу Кур'яновіча маглі перакваліфікаваць, бо актывіста ўжо прыцягвалі да адказнасці за парушэнне парадку правядзення вулічных акцый.

Суддзя Леанід Ярмоленка, відаць, з перасцярогі за таямніцу такой важнай дзяржаўнай справы, як суд за ўлёткі, забараніў весці аўдыёзапіс паседжання, раней былі забароненыя фотаздымкі ў Першамайскім судзе, у тым ліку і да пачатку працэсу. Рашэннем суда Павел аштрафаваны на 10 базавых велічыняў.



**АД ПЕРШАЙ АСОБЫ**

# Ханс-Ёхан Шмідт: ДЗЕЙНІЧАЦЬ У АГУЛЬНЫМ ПОЛІ АКТЫЎНАСЦІ

◂ **Працяг. Пачатак на стар. 1.**

Аднак, на мой погляд, тут неабходны вельмі дакладны баланс. Каб, імкнучыся да лепшага, не зрабіць горш для той жа апазіцыі і, галоўнае, для насельніцтва. Наш мандат абавязвае нас развіваць кантакты, якія ідуць на карысць вашай краіне. У гэтым кантэксце, адзначу, мы не маем права рэалізоўваць ні адзін праект без згоды выканаўчай улады. І было б няправільным, калі б кіраўнік офіса ператвараўся ў гульца на ўнутраным палітычным полі. Гэта не функцыя кіраўніка офіса АБСЕ. І я вельмі ўдзячны прадстаўнікам грамадства, якія разумеюць нас і цесна супрацоўнічаюць з намі ў розных галінах.

Лічу, што за апошнія месяцы мы здолелі павялічыць колькасць мерапрыемстваў, а гэта на карысць развіццю грамадства. Мабыць упершыню за многія гады кіраўнік офіса АБСЕ атрымаў магчымасць зрабіць шэраг публічных выступаў, у тым ліку на тэлебачанні. Гэта дазволіла мне распавесці людзям пра значэнне свабоды слова, пра правы грамадзян на стварэнне грамадскіх аб'яднанняў, на правядзенне сходаў, мітынгаў і дэманстрацый.

Каб паспяхова працаваць тут для развіцця краіны, нам здаецца важным развіваць кантакты, фармаваць поле даверу не толькі з грамадствам, але і з прадстаўнікамі ўлады. Гэта часам цяжка растлумачыць абодвум бакам. Але ў нас ёсць добрая каманда, і вельмі важна, што ў гэтай камандзе ёсць беларускія супрацоўнікі, якія добра ведаюць сваю краіну. Мы ім вельмі ўдзячныя.

Характэрна і іншая дэталь: сёлета ўлады паведамілі нам пра сваю гатоўнасць працягнуць мандат місіі не ў апошні момант, як у папярэднія гады, а загадзя. І не толькі працягнуць, але і аказаць спрыянне ў паляпшэнні ўмоў працы. Гэта зроблена для таго, каб паказаць, што Беларусь сапраўды гатовая актыўна працаваць не толькі з АБСЕ як арганізацыяй, але і з яе місіяй у Мінску на прынцыпах даверу.

***— Калі кажуць, што палітыка ізаляцыі не прынесла вынікаў, неяк выпускаецца з поля зроку, што гэта была палітыка самаізаляцыі, характэрная для ўсіх аўтарытарных рэжымаў. З такімі рэжымамі дэмакратычныя краіны падтрымліваюць звычайныя міждзяржаўныя адносіны. Гэта значыць, сёння мы назіраем па сутнасці вяртанне не да дыялога як такога, не да поўнамаштабнага, глыбокага і ўсебаковага супрацоўніцтва на аснове агульных прынцыпаў, агульных каштоўнасцяў, а да больш-менш нармальных кантактаў. На ваш погляд, гэтая палітыка кантактаў пашырылася? І якія яе перспектывы?***




— Вядома, развіццё гэтых кантактаў у бок паўнавартаснага дыялога шмат у чым вызначаецца ўнутранымі параметрамі развіцця грамадзянскай супольнасці. І задача місіі — спрыяць гэтаму. Аднак не на шляху палітызацыі, як я ўжо казаў, а на шляхах садзейнічання развіццю ўнутранага дыялога паміж грамадствам і ўладай. Мы можам прывесці шэраг прыкладаў дастаткова паспяховага, на карысць насельніцтву, супрацоўніцтва грамадскіх арганізацый з уладамі ў рэгіёнах. Гэтаму і спрыяем.

Натуральная сфера развіцця супрацоўніцтва — эканамічная. Важным, на наш погляд, з'яўляецца лібералізацыя візавага рэжыму. Я здзіўлены тым фактам, што большасць насельніцтва не вельмі добра ведае заходнія краіны, што каля 70 працэнтаў жыхароў Беларусі ні разу не выязджалі за мяжу, што больш паловы жыхароў краіны ні разу не мелі стасункаў ні з адным замежнікам — такія дадзеныя вашых сацыялагічных даследаванняў. І гэта вынік, у тым ліку, і высокага кошту віз. Калі Еўрасаюз хоча палепшыць імідж заходніх краін у вачах насельніцтва Беларусі, ён павінен паслабіць візавы рэжым, што, дарэчы, добра разумеюць краіны «новай» Еўропы і не вельмі добра — «старой».

Адкрыць межы з нашага боку — азначае павялічыць давер да нас, спрыяць стварэнню калідора з захаду на ўсход, з поўначы на поўдзень. Гэта значыць, неабкладна выкарыстаць на карысць Беларусі яе выгоднае геаграфічнае становішча для пашырэння яе міжчалавечых, турыстычных, эканамічных, культурных і камерцыйных кантактаў. Развіццё гэтых сувязяў абсалютна не ідзе на шкоду сувязям з Расіяй.

Мая краіна, Германія, пасля вайны аднаўлялася, у тым ліку і абапіраючыся на крэдыты ЗША на вельмі льготных умовах. Гэтыя крэдыты Германіі ды іншым краінам даваліся не толькі з гуманных меркаванняў, але і каб забяспечыць экспартныя рынкі.

Беларусі вельмі бракуе заходніх інвестыцый для мадэрнізацыі эканомікі. У гэтым ёсць наўпроставая зацікаўленасць вашага палітычнага кіраўніцтва, асабліва цяпер, калі вы шукайце шляхі выйсця з эканамічнага крызісу, але ў вас няма выхаду да крэдытных рынкаў. Мы бачым сваю задачу яшчэ і ў тым, каб паказаць насельніцтву, што дыялог — шлях да паляпшэння яго сацыяльна-эканамічнай базы, яго дабрабыту.

***— Гэта разуменне прыходзіць у тым ліку і да ўладных структур. Але іх стрымлівае боязь страціць свае пазіцыі — як палітычныя, так і эканамічныя (свой уласны дабрабыт).***

— Прагрэс у супрацоўніцтве, прагрэс у паляпшэнні дабрабыту насельніцтва праз развіццё супрацоўніцтва — на жаль, шлях досыць доўгі. Яго немагчыма прайсці за паўгода. Да прыкладу, нашы праекты разглядаюцца беларускім бокам часам вельмі працяглы тэрмін. Супярэчаць інтарэсам Беларусі і недастаткова абгрунтаваныя арышты з наступным зацягваннем адкрытых судовых працэсаў для высвятлення ісціны, ступені віны арыштаваных. Як гэта адбываецца, напрыклад, са справай Аўтуховіча і яго калегаў. Гэта правакуе адмоўную рэакцыю і ў Беларусі, і за яе межамі.

***— Саміт у Празе 7 мая па сутнасці завяршыў першы этап палітыкі дыялога: Беларусь здабыла статус паўнапраўнага ўдзельніка праграмы «Усходняе партнёрства». Але гэты этап быў няпросты, адзначаны відавочнымі супярэчнасцямі ў стаўленні да Беларусі розных еўрапейскіх краінаў і палітыкаў. У якой ступені, на Ваш погляд, дасягнута адзінства краін ЕС па беларускай лініі праграмы? Якія ў гэтым адзінстве суадносіны прагматычных разлікаў і каштоўнаснай асновы? І як усё гэта можа адбіцца на рэалізацыі праграмы?***

— На мой погляд, вельмі важна, што Беларусь уключаная ў праграму. Яшчэ некалькі месяцаў таму ў гэтым не было поўнай упэўненасці. З іншага боку, нягледзячы на ўключэнне Беларусі, адносіны з ёй Еўрасаюза будуць развівацца ў адпаведнасці з умовамі і магчымасцямі, якія існуюць у самой Беларусі. Я лічу, што ў эканамічных сферах, у галіне бяспекі, у пытаннях функцыянавання мытняў, арганізацыі кантролю на межах, у рэгуляванні міграцыйных плыняў і г. д. будзе параўнальна лёгка дасягнуць дамоўленасцяў. Еўрасаюз — і гэта таксама ёсць узгодненая пазіцыя ў рамках праграмы партнёрства — зацікаўлены развіваць адносіны і ў іншых сферах. У банкаўскай, напрыклад. У стварэнні роўных умоў для ўсіх гульцоў, роўных магчымасцяў і адкрытасці для ўсіх удзельнікаў, напрыклад, на атрыманне тэндэраў. Гэта адаб'ецца і на стане палітычнага поля. Лібералізуючы эканоміку, вы адчыняеце перад насельніцтвам зусім іншыя магчымасці арганізацыі грамадскага жыцця.

І баяцца гэтага не трэба. Чым вышэй ступень інфармавання насельніцтва, тым лягчэй і бяспечней даецца выхад з крызісу. Значна больш небяспечна кіраваць краінай, насельніцтва якой не мае дастатковай інфармацыі. І гэтаму ў вашай гісторыі ёсць яркі прыклад. Утойванне інфармацыі пра Чарнобыльскую катастрофу з'явілася, думаю, асноўным чыннікам палітычнага пахавання Гарбачова. У сучасным свеце празрыстасць з'яўляецца галоўным фактарам у арганізацыі эканамічнага і палітычнага жыцця грамадства.

***— Вы лічыце, што адрозненні ў пазіцыі заходніх партнёраў сур'ёзна не паўплываюць на характар дыялога і на развіццё адносін з Беларуссю, што прагматыка партнёрства будзе адэкватнай каштоўнасным устаноўкам?***

— Супярэчнасці і ўзаемная крытыка — норма дэмакратычна арганізаваных структур на шляху да ўзгодненых рашэнняў. Тым больш, калі ў гэтай структуры 27 самастойных краін. Але мне было прыемна чуць словы былога міністра замежных спраў Германіі, які нядаўна ўзгадаў, якой жорсткай крытыцы падвяргалася ў свой час наша краіна за яе нежаданне адмовіцца ад маркі на карысць еўра. Увіце сабе, падкрэсліў ён, з якімі б непараўнальнымі цяжкасцямі мы сутыкнуліся б цяпер, у час эканамічнага крызісу, калі б захавалі марку і не перайшлі на еўра.

Палітычныя і эканамічныя працэсы маюць розную дынаміку ў розныя эпохі, у розных краінах. Трэба мець цярпенне. Хто калісьці думаў, што Іспанія ператворыцца ў аднаго з самых актыўных і аўтарытэтных еўрапейскіх партнёраў? А досвед Польшчы, якой таксама няпроста было прайсці працэс мадэрнізацыі, паказаў магчымасці Еўрасаюза адказаць на выклік інтэграцыі ў яго межы краін з цалкам іншай сістэмай.

Думаю, што інтарэс Беларусі ва «Усходнім партнёрстве» — у магчымасцях ажыццявіць мадэрнізацыю эканомікі і стварыць такую матэрыяльную базу, якая дазволіць насельніцтву перажыць крызіс і выйсці на годны ўзровень дабрабыту тут, у роднай краіне, не ад'язджаючы за мяжу. Дазволіць пазбегнуць уцечкі кваліфікаваных кадраў і мазгоў.

Найперш трэба стварыць для моладзі ўмовы для самарэалізацыі. Мы шмат працуем з універсітэтамі, я ведаю, якая таленавітая ваша моладзь. Праблема моладзі, дарэчы, — гэта праблема і апазіцыі, якая ў асноўным сталага веку. Я сам немалады чалавек, і з вышыні свайго ўзросту, у кантэксце ўсяго гістарычнага досведу, асабліва выразна разумею, якімі негатыўнымі наступствамі для краіны пагражае страта моладзі. Аж да страты самой краіны.

Павінен адзначыць, што разумення ўсяго комплексу складаных праблем, што стаяць перад Беларуссю, у асяроддзі афіцыйных структур, асабліва сярод іх маладых прадстаўнікоў, робіцца ўсё больш.

***— Кіраўнік Еўрапарламента Ханс-Герт Петэрынг заклікаў перад самітам у Празе да «крытычнага дыялога з Беларуссю». Якім чынам можа адбіцца гэтая пазіцыя на фармаце палітыкі партнёрства?***

— Я думаю, што Еўрапарламент, еўрадэпутаты, у тым ліку і новаабраныя, будуць аналізаваць палітычны працэс у Беларусі. Я думаю, у інтарэсах кіраўніцтва краіны адказаць станоўча на чаканні, якія грунтуюцца на прынцыпах, падпісаных у тым ліку і беларускім бокам. Маю на ўвазе дэкларацыю Стамбульскага саміту.

***— Ад пазіцыі Захаду шмат у чым залежыць лёс трох арыштаваных — Аўтуховіча, Лявонава і Асіпенкі. Якая гэтая пазіцыя?***

— Я думаю, адказам на іх арышт і з'явілася хваля крытыкі ў дачыненні да беларускіх уладаў. Ускладняе гэты факт і працэс збліжэння ў рамках дыялога. Наша пазіцыя ў тым, каб як мага хутчэй адбыўся аб'ектыўны судовы працэс, які б даў арыштаваным магчымасць даказаць сваю невінаватасць.

***— Якое ўяўленне пра Беларусь склалася ў Вас за 14 месяцаў жыцця тут?***

— Уражвае, што, нягледзячы на эканамічны крызіс, у настроях людзей пераважае аптымізм. Уражвае маладая Беларусь, моладзь Беларусі, з яе цікавасцю да новага, з яе пільнай увагай да развіцця эканамічнай і палітычнай сітуацыі ў краіне і ў свеце, з яе жаданнем атрымаць добрую адукацыю і на карысць сабе і краіне.

ПАМЯЦЬ

# АХВЯРЫ МІРНАГА ЧАСУ

Вольга ХВОІН

**9 мая на постсавецкай прасторы памінаюць людзей, якія загінулі ці зніклі падчас Вялікай Айчыннай вайны. За два дні да гэтай агульнавядомай даты — 7 мая стала негалосным днём памяці тых, хто знік без вестак у сучаснай і мірнай Беларусі. У гэты дзень дзесяць гадоў таму знік Юрый Захаранка — першы ў ланцужку прапаўшых без вестак апанентаў улады. Пасля зніклі палітык Віктар Ганчар, бізнесмен Анатоль Красоўскі, тэлеаператар Дзмітрый Завадскі. Яшчэ да знікнення Юрыя Захаранкі нечакана памёр палітык Генадзь Карпенка.**

Гучныя справы знікнення вядомых людзей, якія да таго ж былі ў апазіцыі да Лукашэнкі (з гэтага шэрагу хіба выбіваецца тэлеаператар Дзмітрый Завадскі), да канца так і не былі расследаваныя. Факты, сабраныя па справе былым кіраўніком КДБ Уладзімірам Мацкевічам, былым генеральным пракурорам Алегам Бажэлкам і генерал-маёрам міліцыі Мікалаем Лапацікам, недвухсэнсоўна выводзілі на людзей з атачэння кіраўніка дзяржавы — Віктара Шэймана, Дзмітрыя Паўлічэнку і Юрыя Сівакова. Кропка ў гэтых справах дагэтуль не пастаўленая, але выразным акцэнтам у свой час стаў даклад спецдакладчыка Парламенцкай асамблеі Рады Еўропы Хрыстаса Пургурыдзіса, пасля якога Віктару Шэйману, Уладзіміру Навумаву, Юрыю Сівакову і Дзмітрыю Паўлічэнку быў забаронены ўезд у Еўропу. Персонамі нон-грата яны застаюцца і цяпер.

Натуральна, з часам шум вакол знікнення людзей згас — новыя падзеі, новае жыццё. Але для кіраўніцтва дзяржавы той скандал быў знакам, што метады барацьбы з апанентамі трэба змяніць. І яны змяніліся. Арышты, затрыманні, запалохванні, шантаж, штрафы, турэмныя тэрміны. Былы палітвязень і экс-кандыдат на пасаду прэзідэнта Аляксандр Казулін адзначае, што фактычна апаненты Лукашэнкі, якія прапалі без вестак, сваім жыццём ахвяравалі, каб падобныя прэцэдэнты больш не паўтараліся. «На сваім асабістым прыкладзе магу сказаць, калі б не было тых знікненняў, то і мяне магло б не быць», — гаворыць палітык.

Штогод незарэгістраванае праваабарончае аб'яднанне «Вясна» рыхтуе справаздачу пра парушэнні правоў чалавека ў Беларусі, і палітычныя справы ў даволі аб'ёмнай кнізе-хроніцы займаюць ільвіную долю. Цягам апошніх гадоў міжнародная арганізацыя *Amnesty International* прызнала вязнямі сумлення больш за дзесятак асуджаных у Беларусі асобаў.

Літаральна на днях вязнямі сумлення былі прызнаныя ўдзельнікі «працэсу 14-ці». Адпаведны афіцыйны ліст быў накіраваны на імя генеральнага пракурора Беларусі Рыгора Васілевіча. Прадстаўнік *Amnesty International* Нікаля Дакварс, дырэктар па справах рэгіёнаў Еўропы і Цэнтральнай Азіі, у сваім звароце да генпракурора Беларусі ў прыватнасці адзначыў: «Я пішу вам з нагоды справы 11 маладых людзей, якія былі падвергнутыя абмежаванню волі за ўдзел у акцыі пратэсту 10 студзеня 2008 года ў Мінску. *Amnesty International* упэўненая, што яны былі падвергнутыя пакаранню за мірнае ажыццяўленне свайго права на свабоду мірных сходаў і свабоду выказвання меркаванняў. У сувязі з гэтым мы абвяшчаем іх вязнямі сумлення».

У сваім паведамленні *Amnesty International* называе 11 фігурантаў «справы 14-ці» — Арцёма Дубскага, Міхася Пашкевіча, Тацціяну Цішкевіч, Паўла Вінаградава, Аляксея Бондара, Міхася Крывава, Алеся Стральцова, Алеся Чарнышова, Міхася Субача, Максіма Дашука, Аляксандра Баразенку. Вязнямі сумлення арганізацыя прызнала тых, хто на дадзены момант адбывае пакаранне ў выглядзе абмежавання волі. Зараз яны фактычна знаходзяцца пад хатнім арыштам, пад вельмі пільным назіраннем, і пры самым дробным парушэнні ў любы момант могуць апынуцца за кратамі. Яшчэ два фігуранты гэтай крымінальнай справы Антось Койпіш і Уладзімір Сяргееў былі пакараныя штрафамі.

Нікаля Дакварс у сваім звароце да генпракурора Васілевіча заклікае вызваліць пералічаных фігурантаў «справы 14-ці» ад пакарання, а таксама правесці расследаванне наконт збіцця Аляксандра Бараzенкі афіцэрам міліцыі, што адбылося 23 сакавіка. Нагадаю, крымінальная «справа 14-ці» была заведзена ў дачыненні да ўдзельнікаў мірнай акцыі пратэсту прадпрымальнікаў, што адбылася ў Мінску 10 студзеня 2008 года.

З незадаволенымі рэжым цяпер абыходзіцца больш «гуманна», калі можна так сказаць, абіраючы метады не фізічнага знішчэння, а стварэння абмежаванняў і рамак. Напрыклад, так званая «хатняя хімія» — адно з найноўшых вынаходніцтваў уладаў у барацьбе з іншадумцамі — чалавек быццам бы і на свабодзе, розгалас меншы, але ў той жа час пад няспынным кантролем. Апошнія вулічныя акцыі паказалі, што і разгон цяпер не прымаецца за эфектыўны сродак: АМАП збівае пікетоўшчыкаў не пад прыцэлам фота- і відэакамер, а паціху, калі людзі разыходзяцца па дамах.

«Многія дыктатарскія рэжымы праходзілі праз перыяд, калі знікалі апаненты ўлады, — адзначае праваабаронца Алег Волчак. — Мы памятаем, наколькі тады быў моцны дэмакратычны рух. Улады спужаліся і пайшлі на крайнія меры. Ніхто з прапаўшых без вестак апанентаў не з'ехаў за мяжу, не схаваўся ў лесе. З першых дзён знікнення Захаранкі было вядома, што яго звезлі ў невядомым накірунку. Міжнародная практыка паказвае, што, калі такія справы становяцца вядомыя грамадскасці, улада адыходзіць ад варыянту фізічнага знішчэння і пераходзіць да палітвязняў. У 2006 годзе быў моцны ціск з боку спецслужбаў на кандыдатаў у прэзідэнты Аляксандра Казуліна і Аляксандра Мілінкевіча. Казулін пасля аказаўся ў турме. Дзякуючы таму, што факты па справах знікнення людзей рассакрэціліся, улады збаяліся паўтараць старую практыку».

Алег Волчак лічыць, што Лукашэнка ніколі не пойдзе на сапраўдны дыялог з Еўропай, бо ад яго запатрабуюць адкрытага следства. «Ёсць рэзалюцыя АБСЕ, Рады Еўропы, што гэта расследаванне мусіць быць шырокім, адкрытым. Беларусь супрацоўнічае з Рабочай групай па недобраахвотных знікненнях пры Радзе па правах чалавека ААН, але інфармацыю туды падаюць дазаваную», — адзначае праваабаронца.

ТЛУМАЧЭННІ

# «УСХОДНЯЕ ПАРТНЁРСТВА» І АПАЗІЦЫЯ

Вольга ХВОІН

**Пасля вяртання беларускай дэлегацыі з саміту «Усходняга партнёрства» вакол асобы Аляксандра Мілінкевіча разгарэўся скандал, які ледзь не захінуў сабой саму падзею ў Празе. Кіраўнік руху «За свабоду» адмовіўся падпісаць сумесную заяву з Зянонам Пазьняком, Аляксандрам Казуліным, Івонкай Сурвілай і Станіславам Шушкевічам. Аляксандр Мілінкевіч за сваю лаяльную пазіцыю адносна ваўкавыскіх вязняў-прадпрымальнікаў яшчэ да гэтага зрабіўся аб'ектам нападак, цяпер жа ўвогуле пачаліся размовы пра раскол апазіцыі. Аднак падчас тэрмінова скліканай прэс-канферэнцыі палітык заявіў, што гэта ўсяго толькі розныя падыходы да рэалізацыі праграмы.**



Фота Юрыя Дзядзінкіна

Аляксандр Мілінкевіч

Свой подпіс пад дэкларацыяй Аляксандр Мілінкевіч адмовіўся ставіць толькі з-за аднаго пункту, у якім гаварылася, што кіраўнік Беларусі і Крэмль маюць сумесную стратэгію ў дачыненні да ўдзелу Беларусі ва «Усходнім партнёрстве». На думку кіраўніка руху «За свабоду», гэта меркаванне з'яўляецца неабгрунтаваным. Палітык цалкам пазітыўна ставіцца да праграмы Еўрасаюза. Разам з тым ён адзначыў, што цяпер у Еўропе ад Беларусі чакаюць не простай канстатацыі фактаў, а канкрэтных прапаноў.

«Дайце канкрэтныя тэхналогіі, прапануйце, што зрабіць, каб сітуацыя паляпшалася, а не займайцеся простай фіксацыяй парушэнняў правоў чалавека», — сфармуляваў патрабаванні чыноўнікаў ЕС палітык. Ён заклікаў прадстаўнікоў апазіцыі «пазбавіцца палітычнага інфантылізму»: «Зараз удзел наш будзе вызначацца самастойна. Кожны бок мусіць прапанаваць свае праекты. Сітуацыя настолькі змянілася для дэмакратычных сілаў, што старая сістэма, у якой мы працавалі, адыходзіць у нябыт. Сёння ўвесь час палітыкі Захаду гавораць, што выдатна разумеюць стан спраў. Але просяць прапанаваць тэхналогіі. Мова заяў — гэта не мова тэхналогій. І мы павінны да гэтага прыйсці». Мілінкевіч паведаміў, што неафіцыйная дэлегацыя Беларусі канцэнтравала ўвагу на тым, каб у праграме ўдзельнічала грамадзянская супольнасць, лідэры грамадскіх арганізацый, незалежныя медыя.

Што тычыцца пытанняў супрацоўніцтва з афіцыйным рэжымам, то Мілінкевіч заклікаў рабіць не толькі чорныя, але і каляровыя ацэнкі яго дзеянням. «Улада добраахвотна рабіць дэмакратызацыю не будзе. Яна можа гэта рабіць толькі вымушана пад ціскам эканамічных праблем, настойлівай пазіцыі Еўрасаюзу, нашай. Таму супрацоўніцтва я бачу такім чынам: калі ўлады падпісваюць праграму «Усходняе партнёрства», то гэта пазітыўны крок, калі садзяць у турму Аўтуховіча і яго сяброў, і мы разумеем, што гэта хутчэй за ўсё палітычны пераслед, мы павінны пра гэта гаварыць, — адзначыў палітык. — Але ў ацэнцы дзеяння ўладаў мы не павінны быць толькі чорнымі, але і белымі, і каляровымі. Што тычыцца эканомікі, то магчымасці зменаў у руках улады. Мы не кіруем эканомікай, прадпрыемствамі, міністэрствамі. Але што тычыцца грамадзянскіх свабод, доступу да інфармацыі, еўрапейскай адукацыі — гэта перш за ўсё павінныя рабіць мы. У гэтай праграме ёсць канкрэтныя грошы, якіх нам заўсёды не хапае. Таму цяпер трэба пісаць адпаведныя праекты».

Кіраўнік руху «За свабоду» выказаў шкадаванне, што ў афіцыйнай дэлегацыі ў Празе не было Лукашэнкі: «Ёсць шкадаванне. Я хачу, каб Беларусь была прадстаўлена на самым высокім узроўні, але зразумела, што Аляксандр Лукашэнка сваёй дзейнасцю па дэмакратызацыі за апошнія шэсць месяцаў не заслужыў такога запрашэння. Вельмі важна, каб Беларусь у будучыні на падобных форумах была прадстаўлена вышэйшымі службовымі асобамі, гэта дасць нам дадатковыя магчымасці. Мала крокаў яшчэ зроблена. І ўлада павінна ведаць, што не будзе эканамічнага супрацоўніцтва, фінансавай падтрымкі, калі не будзе канкрэтных зменаў».

Палітык заявіў, што вельмі задаволены візітам, хаця ён збольшага і меў фармальны сэнс, а таксама жаданнем еўрапейцаў бачыць нашу краіну ў незалежным грамадстве.

АДУКАЦЫЯ

# ЕГУ ПАМІЖ МІНУЛЫМ І БУДУЧЫМ

Вольга ХВОІН

**У актавай залі Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта, пад завязку набітай бацькамі і сёлетнімі выпускнікамі школаў, дырэктар па міжнародных сувязях і развіцці ўніверсітэта спадарыня Мары Соўз расказвае пра ЕГУ як «мост паміж мінулым і будучым» і просіць адказаць маладзёнаў на некалькі пытанняў.**

Спачатку яна цікавіцца, ці ведаюць патэнцыйныя абітурыенты еўрапейскія мовы — падымаецца шэраг рук. Пасля задае пытанне: «Хто хацеў бы вучыцца на гэтых мовах?» Сваё імкненне да адукацыі на англійскай, нямецкай, французскай дэманструе меншая колькасць маладых людзей. Натуральна, ахвоту наведаць еўрапейскія краіны выказалі ці не ўсе прысутныя. А вось вывучыць еўрапейскія мовы, атрымаць еўрапейскую адукацыю, досвед, а пасля вярнуцца ў Беларусь і працаваць тут на карысць сабе і краіне пагадзіліся ўсяго толькі некалькі чалавек.

Еўрапейскі гуманітарны універсітэт пакрысе адыходзіць ад іміджу «універсітэта ў выгнанні для выгнаных студэнтаў». Цяпер, каб стаць студэнтам гэтага універсітэта, недастаткова мець заслугі перад дэмакратычнай грамадзянскай супольнасцю Беларусі. Сёлета ЕГУ амаль цалкам пераходзіць на камерцыйныя рэйкі. Платным становіцца навучанне на дыстанцыйных курсах, бакалаўрыяце, у магістратуры. Праўда, кіраўніцтва універсітэта паабяцала, што прыблізна дзесяць найлепшых студэнтаў-першакурснікаў на кожнай з праграм бакалаўрыяту могуць разлічваць на падтрымку ў выглядзе стыпендый. Але ўсе падрабязнасці будуць вядомыя толькі з 1 ліпеня гэтага года.

Сабекошт навучання студэнта на працягу года складае прыблізна тры тысячы еўра. Для грамадзян Беларусі зацверджаны льготныя тарыфы. Льготная адукацыя для беларусаў у ЕГУ магчымая дзякуючы падтрымцы міжнародных донараў і літоўскага ўраду. У прыватнасці, штогадовая датацыя ад ураду Літвы на навучанне кожнага студэнта бакалаўрыята складае 615 еўра. Льготная аплата за навучанне для беларусаў складае 1 200 еўра для студэнтаў бакалаўрыяту дзённай формы навучання, 550 еўра — для студэнтаў бакалаўрыяту завочнай формы навучання, 500 еўра для магістрантаў і 15 еўра для слухачоў дыстанцыйных курсаў за адзін вучэбны прадмет.

Рэктар універсітэта Анатоль Міхайлаў падкрэсліў, што ніводны беларускі студэнт не аплачвае сваё навучанне ў поўнай меры. «Нас падтрымлівае не адна краіна. Я не магу расказаць, якіх высілкаў патрабуе пошук сродкаў, тым больш гэта цяжка ў перыяд фінансава-эканамічнага крызісу. І, безумоўна, меркаваць, што ўвесь свет будзе напружвацца, каб фінансава падтрымліваць нашых студэнтаў — наіўна, — тлумачыць прычыны пераменаў у фінансавай палітыцы універсітэта рэктар, закранаючы і аспекты адносінаў «донар-рэцыпіент». — У маральных адносінах існаваць за чужы кошт вельмі няпроста. Мы выступаем пастаяннымі прасіцелямі. І ў Мінску, і тут да нашага універсітэта ёсць цікаўнасць. Але за ўвесь гэты час не было ніводнай спробы ўмацаваць фінансавую стабільнасць з боку беларускай бізнес-супольнасці. Я не магу адказаць на пытанне, чаму падтрымка прыходзіць толькі з-за мяжы. Мы звяртаемся да ўрадаў Венгрыі, Славакіі, Чэхіі, іншых краінаў Еўропы, Амерыкі і просім іх дапамагчы. Але мне падаецца, што ўсё ж за чужы кошт зневажае. І я думаю, што не варта так інтэнсіўна эксплуатаваць гатоўнасць гэтых краінаў падтрымаць нас фінансава».

Заўважу, што найбольш з фінансавага боку пашанцавала студэнтам, якія вучыліся ў ЕГУ першыя два гады пасля яго пераезду ў Літву: тады яны атрымлівалі поўную кампенсацыю навучання і аплаты жылля. Рэктар ЕГУ Анатоль Міхайлаў лічыць, што «праблемы змянення, трансфармацыі — натуральныя для дзейнасці любой структуры». «Мы зарэгістраваныя ў якасці літоўскага ўніверсітэта толькі тры гады таму. Цяпер імкнёмся, каб структура нашага універсітэта стала насамрэч дэмакратычнай: напрыклад, будзе абірацца сенат універсітэта, дакладна раздзяляюцца паўнамоцтвы паміж рознымі структурамі універсітэта, — адзначае рэктар. — Перад намі стаяць працэсы па пераўтварэнню універсітэта пасля рэгістрацыі ў жыццяздольную і эфектыўную адукацыйную структуру, якая павысіць якасць адукацыі, абазначыць месца і ролю універсітэта як беларускага, але разам з тым распазнавальнага і вядомага ў Еўропе і за яе межамі».

# Анатоль Міхайлаў: НЕ НАША ВІНА, ШТО РАЗУМНЫЯ ЛЮДЗІ З'ЯЗДЖАЮЦЬ З БЕЛАРУСІ

**Пра праблемы, перспектывы развіцця і магчымае вяртанне ўстановы на Беларусь распавядае рэктар ЕГУ прафесар Анатоль Міхайлаў.**

***— Ці існуе для ЕГУ перспектыва пераарыентацыі на літоўскіх студэнтаў, што прымусіць скараціць аб'ём выкладання па-беларуску?***

— Практычна гэтай праблемы не існуе. Мы — малады універсітэт у Літве, і праблемы прыёму літоўскіх студэнтаў дагэтуль не было. Па-літоўскі, відавочна, выкладаць мы ўжо не будзем, і было б смешна, калі б мы прэтэндавалі на гэта. Але там, дзе могуць быць рэалізаваныя праграмы з рускай, беларускай, англійскай мовай, мы адкрытыя.

***— Вы робіце нейкі маніторынг настрояў студэнтаў, здзяйсняеце пэўныя захады, каб прадухіліць «вымыванне мазгоў» з Беларусі?***

— Думаю, не наша віна, што разумныя людзі з'язджаюць з Беларусі. Мы робім усё магчымае, каб нарасціць крытычную масу тых, хто можа быць карысны Беларусі. Ёсць адна праблема: мы з'яўляемся універсітэтам гуманітарных і сацыяльных навук. У свеце ў цэлым маецца перавытворчасць кадраў у гэтай сферы, і чакаць, што будзе вялікі попыт на спецыялістаў, не варта. Я спадзяюся, што стан негатыўных адносінаў да нашага універсітэта будзе мець свае рамкі і межы. Калісьці, спадзяюся, нарэшце будзе асэнсавана, што прафесіяналізм патрэбны, каб вывесці нашу краіну са стану біяцэнозу, у якім яна знаходзіцца. Адна справа, калі такія людзі ёсць, іншая — калі іх няма ці калі рыхтуюцца спецыялісты, якія насамрэч такімі не з'яўляюцца. Падрыхтоўка спецыялістаў па гуманітарных дысцыплінах — цяжкая задача. У нас існуе ўяўленне, нібыта ёсць складаныя дысцыпліны, дзе патрэбны талент, — матэматыка, фізіка... Па гуманітарных, калі ты не дэбіл і алігафрэн, за пару дзён можна падрыхтавацца і нешта расказаць. Але гэта не так. І наша прастора мае вялізную патрэбу ў спецыялістах, якія б маглі звярнуцца да трансфармацыі разбуранага грамадства...



Пасвячэнне ў студэнты ЕГУ-2008. Рэктар ЕГУ Анатоль Міхайлаў

***— Пытанне мовы ў ЕГУ шматкроць абмяркоўвалася ў СМІ. І сёння падчас сустрэчы прагучала, што прыкладна толькі чвэрць дысцыплін выкладаюцца па-беларуску. У чым насамрэч праблема, ці яе няма?***

— Справа ў тым, што мы выкладаем сыходзячы з прафесіяналізму выкладчыкаў, і шукаем іх у розных краінах і на розных кантынентах. І калі вы нам прапануеце выкладчыка, які прызнаны навуковай супольнасцю свету і можа выкладаць па-беларуску, мы будзем вам вельмі ўдзячнымі. Нам даводзіцца гаварыць пра сябе даволі сціпла. Наша доўгае падзенне прывяло да таго, што цяпер, на жаль, у нас няма спецыялістаў у гуманітарнай сферы. Не з'яўлялася Беларусь тым аазісам ні раней, ні цяпер, куды б хацелі прыехаць і павучыцца з усіх краінаў. Назавіце мне тых, хто мае публікацыі, прызнаны ў свеце, з'яўляецца сябрам высокапрафесійнай супольнасці. Філасофія — мая дысцыпліна. Дзе тыя выдатнейшыя працы, якія перакладаюцца з беларускай мовы на замежныя? Калі ўзнікне такая задача, ці знойдзецца нехта, хто зможа перакласці на беларускую «Фенаменалогію духу» Гегеля? Я лічу, што гэта немагчыма, бо чалавек, які не з'яўляецца спецыялістам у галіне філасофіі, наперакладае такога, што будзе звычайнае глупства. Ніводнаму спецыялісту, які выдатна ведае нямецкую і беларускую мову, я не магу даверыць ніводнай старонкі тэксту.

***— А вы можаце займацца такімі перакладамі?***

— У мяне бацька беларус, я жыву доўгі час у Беларусі, магу гаварыць па-беларуску. Але праблема моўнай творчасці даволі сур'ёзная. Мне цяжка адчуваць сябе адначасова добра ва ўсіх стыхіях.

***— Пры ЕГУ пачалі абараняцца доктарскія дысертацыі. Як справы на гэтай ніве?***

— Мы цяпер толькі плануем стварыць свае доктарскія праграмы. Але пакуль іх няма, нашы супрацоўнікі абараняюцца ў межах нашых кантактаў з адукацыйнымі ўстановамі Літвы. І гэты працэс пакрысе набірае абароты. Ужо абаранілася дзве асобы, на падыходзе яшчэ некалькі чалавек.

***— Вяртанне універсітэта ў Беларусь усё ж магчымае?***

— Я пакуль пазбаўлены магчымасці мець дакладнае ўяўленне наконт таго, што некаторыя працэсы набіраюць тэмп. Пакуль гэта толькі рыторыка, многа чаго незразумела. Тое, што адбывалася і адбываецца ў адукацыі Беларусі, сумна. Думаю, гэта відавочна для ўсяго свету. Канешне, Беларусь можа спадзявацца, што яна ў галіне навукі і адукацыі наперадзе планеты ўсёй. Але нічым добрым гэта не скончыцца. Думаю, пра магчымасці нашага вяртання можна будзе гаварыць толькі тады, калі будуць створаныя адпаведныя ўмовы. Нас выгналі і закрылі, і дагэтуль наўздагон ліцыць толькі бруд. Мне вядома, што Мартынаў (міністр МЗС — рэд.) заявіў у Берліне, што падставаю для закрыцця ЕГУ стала тое, што універсітэт не прытрымліваўся беларускіх стандартаў. І дзякуй Богу. Калі б мы іх трымаліся, то сталі б стандартным беларускім універсітэтам, але гэта ні ў якім разе не з'яўляецца нашай мэтай. Мы дайшлі ў Беларусі да такога стану, калі нецта нарэшце мусіць мяняцца. На жаль, самасвядомасць цяпер у глыбокім крызісе. Гэта нагадвае сітуацыю, калі ўрач пачынае лячыць хворага не на ранняй стадыі, а калі ўжо пайшлі метастазы. Што можна гаварыць пра прафесіяналізм тых, хто давёў сацыяльны арганізм да такога і цяпер пачынае «лячыць» тымі ж метадамі... У многіх краінах свету разумеюць, наколькі важна адукацыя, каб рыхтаваць грамадства да вырашэння праблем і адказу выклікам. Чаго пакуль не скажаш пра Беларусь, дзе ўсё застаецца на ўзроўні дамарослага мыслення, правінцыйнай свядомасці.



Пасвячэнне ў студэнты ЕГУ-2008

***P.S.*** Пасля сустрэчы з кіраўніцтвам Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта з Вільні вярталася адным аўтобусе з калегам, які выкладае там для студэнтаў бакалаўрыяту. Паводле яго слоў, летась ён быў вымушаны цалкам перакласці свой курс з беларускай на рускую мову, бо ў групе навучаюцца грамадзяне Расіі, якія плацяць за адукацыю і, натуральна, патрабуюць, каб выкладанне вялося на зразумелай ім мове. Ці многа яшчэ «беларускага часу» адмерана універсітэту ў выгнанні...

7

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 18 мая, панядзелак

05.35 Серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
06.05, 07.05, 08.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
06.45, 07.45 Зона Х.
07.30, 08.25, 11.50 Дзелавое жыццё.
08.20 Гатуем разам.
08.30 У свеце матораў.
09.05, 15.25 «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
09.10 Nota Bene.
09.35 «Зорныя танцы».
11.05 Серыял «Два бакі адной Ганны».
12.10 Прыгодніцкая камедыя «4 таксісты і сабака» (Расія).
14.05 Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё». «Захапленні майго мужа».
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.30 Культурныя людзі.
16.05 Гульнявое шоў «Інтуіцыя».
16.50 Прэм'ера. Меладраматычны серыял «Тэрыторыя прыгажосці». 1-я серыя.
17.50 Серыял «Два бакі адной Ганны».
18.50, 01.00 «Зона Х». Крымінальная хроніка.
19.35 «Арэна». Праграма аб спорце.
19.55 Ток-шоў «Ход у адказ».
21.00 Панарама.
21.50 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні».
22.55 Баявік «Прысуджаны» (ЗША).
01.05 Дзень спорту.
01.20 Камедыйны серыял «30 РОК» (ЗША). 1-я серыя.

06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00 Нашы навіны.
06.05 АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
09.05 Контуры.
10.10 АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
10.40 Мультфільм.
11.00 Нашы навіны.
11.05 Навіны спорту.
11.10 «Кантрольны закуп».
11.40 «Ералаш».
12.05 «Малахаў+».
13.00 Нашы навіны.
13.05 Навіны спорту.
13.10 «Зразумець. Прабачыць».
13.45 «Модны прысуд».
14.45 «Хачу ведаць».
15.10 «Рэкламная паўза».
16.00 Нашы навіны.
16.10 Навіны спорту.
16.15 «Песні маёй краіны».Фінал.
18.00 Нашы навіны.
18.15 Навіны спорту.
18.20 «Песні маёй краіны».Фінал. Працяг.
19.05 Чакай мяне.
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
21.00 Навіны спорту.
21.05 Ток-шоў «Выбар».
22.05 Прэм'ера. «Паляванне на Берыю». Шматсерыйны фільм.
23.10 Нашы навіны.
23.25 Навіны спорту.
23.30 «Зваротны адлік».
00.00 «Авіяслалам. Чэмпіянат свету».
00.55 Нашы навіны.
01.10 Навіны спорту.

06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
06.10 «Раніца. Студыя добрага настрою».
08.30 «Тыдзень».
09.30 «Вялікі сняданак».
10.00 «Пяць гісторый».
10.55 «Танга ўтрох». Тэленавэла.
11.45 «Сіла прыцягнення». Серыял.
12.40 «Званая вячэра».
13.50 Фільм «Толькі пасля вас». Францыя.
15.35 «Я - вандроўца».
16.00 «Культурнае жыццё».
16.50 «Спартыўны тыдзень».
17.10 «Наша справа».
17.20 «Міншчына».
17.30 «Званая вячэра».
18.30 «Сіла прыцягнення». Серыял.
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.10 «СТБ-спорт».
20.15 «Добры вечар, маляня».
20.35 Фільм «Перакладчыца». Расія, 2006 г.
22.55 «СТБ-спорт».
23.00 «Сталічны футбол».
23.30 «Баец». Серыял.
00.25 «Гучная справа».

06.55 «ЛАДная раніца».
07.55 Смачна з Барысам Бурдой.
08.20 Тэлебарометр.
08.35 Усё аб бяспецы.
09.05 У гэты дзень.
09.10 Гадзіна суду. Справы сямейныя.
10.00 Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
10.55 Фантастычная камедыя «Маска».
12.35 Слова пісьменніка.
13.05 Дэтэктыў «Справа была ў Гаўрылаўцы» (Расія).
13.55 Мультсерыял «Галактычны футбол».
14.20 Бухта капітанаў.
15.00 Пазакласная гадзіна.
15.10 Таемны густ.
15.40 Экспедыцыя.
16.10 Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
17.05 Смачна з Барысам Бурдой.
17.35 Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
18.35 Навіны культуры.
18.50 Серыял «Тэрмінова ў нумар!».
19.55 Беларуская часіна.
20.55 Калыханка.
21.15 Экспедыцыя.
21.20 Камедыя становішчаў «Ромі і Мішэль на сустрэчы выпускнікоў» (ЗША).
23.05 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
00.00 Хакей. Формула гульні.

### РОССИЯ

07.00 Добрай раніцы, Расія!
09.00 Юбілейны канцэрт Надзеі Кадышавай.
11.00 Весткі.
11.30 «Халодная вайна. Суперагент «Тапаз». Дакументальны фільм.
12.20 Тэлесерыял «Лэдзі Мэр», 2001 г.
13.15 «Кулагін і партнёры».
13.50 Навіны - Беларусь.
14.00 Весткі.
14.20 Меладрама «Раганосец». 1991 г.
15.55 Фільм «Зімовая вішня». 5-я серыя.
16.50 Навіны - Беларусь.
17.00 Весткі.
17.25 «Сумленны дэтэктыў».
17.55 Тэлесерыял «Лэдзі Мэр», 2001 г. Заключная серыя.
18.50 Навіны - Беларусь.
19.00 Весткі.
19.30 Тэлесерыял «Кармеліта».
20.30 Тэлесерыял «Тэрмінова ў нумар-2».
21.30 Тэлесерыял «Трое супраць усіх-2».
22.30 «Нічога асабістага». Інфармацыйнасатырычная праграма.
22.45 «Кулагін і партнёры».
23.15 Навіны - Беларусь.
23.25 «Весткі+».
23.45 «Георгій Нэлеп - зорка савецкай оперы». Дакументальны фільм.
00.35 Заканчэнне эфіру.

### НТВ

06.00, 10.00, 13.00 Сёння.
06.05 Канал «Сёння раніцай».
08.55 «Сёння. Выніковая праграма».
10.25 «Кулінарны паядынак».
11.15 «Кватэрнае пытанне».
12.10 «Следства вялі...».
13.35 Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
15.10 «Прафесія-рэпарцёр».
15.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.00 Сёння.
16.30 Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
18.25 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
19.00 Сёння.
19.35 Вострасюжэтны серыял «Захопнікі».
21.40 «Сумленны панядзелак».
22.35 Дэтэктыўны серыял «Версія».
23.00 Сёння.
23.20 Дэтэктыўны серыял «Версія».
23.50 Баявік «Вікінг».
00.35 «Школа зласлоўя».

### EUROSPORT

09.30 Супербайк. Чэмпіянат свету ў ПАР. Заезд 2-і.
10.30 Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг» у Францыі (По). 2-я гонка.
11.30 Матаспорт па выходных.
12.00 Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 17 гадоў у Германіі. Фінал.
14.00 Тэніс. Турнір WTA у Іспаніі. Фінал.
15.30 Веласпорт. «Тур Італіі». 9-ы этап.
17.15 Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 17 гадоў у Германіі. Фінал.
19.00 Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
19.45 Футбол. Еўрагалы.
20.00 Снукер. Сусветная серыя ў Ірландыі. 2-і дзень.
22.05 Пра рэстлінг. Агляд WWE.
22.30 Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
23.30 Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Total Knock Out.
00.30 Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
01.15 Весь дык так!!!
01.30 Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 17 гадоў у Германіі. Фінал.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

18.00 Аб'ектыў.
18.10 Серыял «Ранча».
18.55 «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Давыд Гарадзенскі».
19.05 «Святаслаў Фёдараў – жыццё пасля смерці», дак. фільм, 2006 г., ч. 3: «Змагар».
19.35 Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма).
20.05 «Пішчалаўскі замак», дак. фільм.
20.30 «Minsk-Mixt–2008», ч. 3: канцэрт гурта «Dali».
20.40 «Еўрапейскі Саюз без сакрэтаў», 9 серыя: «Расея», ч. 1.
21.00 Аб'ектыў (галоўнае выданне).
21.20 Асабісты капітал.
21.35 «Дом дурняў», драма, 2002 г., Расія.
23.20 «Элі Макбіл», тэлесерыял.
00.05 Аб'ектыў.

## 19 мая, аўторак

05.35 Серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
06.05 Дзень спорту.
06.10, 07.05, 08.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
06.45, 07.45 Зона Х.
07.30, 08.30, 11.50 Дзелавое жыццё.
08.20 Гатуем разам.
08.35 «Арэна». Праграма аб спорце.
09.05, 15.55 «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
09.10 Серыял «Галоўны калібр» (Расія).
10.00 Меладрама «Тэрыторыя прыгажосці» (Украіна). 1-я серыя.
10.50 Серыял «Два бакі адной Ганны».
11.40 Відэафільм АТН «Бабруйскі варыянт» цыклу «Зямля беларуская».
12.10 Вострасюжэтны серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні» (ЗША).
13.05 Камедыйны серыял «Монк» (ЗША).
14.05 Ток-шоў «Ход у адказ».
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.25 Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
16.05 Дэтэктыўны серыял «Таямніца «Святога Патрыка» (Украіна). Закл. серыя.
16.55 Меладрама «Тэрыторыя прыгажосці» (Украіна). 2-я серыя.
17.50 Серыял «Два бакі адной Ганны».
18.50, 01.10 «Зона Х». Крымінальная хроніка.
19.30 Сфера інтарэсаў.
19.55 Серыял «Галоўны калібр» (Расія).
21.00 Панарама.
21.50 Вострасюжэтны серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні» (ЗША).
22.45 Хранікальна-дак. цыкл «Эпоха». Мікалай Судзілоўскі- Русель. Фільм 1-ы.
23.25 Спартовая камедыя «Трэнер» (Вялікабрытанія).
01.15 Дзень спорту.
01.30 Камедыйны серыял «30 РОК» (ЗША).

06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00 Нашы навіны.
06.05 АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
09.05 Чакай мяне.
11.00 Нашы навіны.
11.05 Навіны спорту.
11.10 «Адзін супраць усіх».
12.00 «Малахаў+».
13.00 Нашы навіны.
13.05 Навіны спорту.
13.10 «Зразумець. Прабачыць».
13.45 «Модны прысуд».
14.45 «Хачу ведаць».
15.10 «Гарачы лёд». Шматсерыйны фільм.
16.00 Нашы навіны.
16.10 Навіны спорту.
16.15 «Прынцэса цырку». Шматсер. фільм.
17.10 «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
18.00 Нашы навіны.
18.15 Навіны спорту.
18.20 Серыял «Гуманоіды ў Каралёве».
18.55 «Рудая». Шматсерыйны фільм.
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
21.00 Навіны спорту.
21.05 «Шальны анёл». Шматсер. фільм.
22.10 Прэм'ера. «Паляванне на Берыю». Шматсерыйны фільм.
23.15 Нашы навіны.
23.30 Навіны спорту.
23.35 «Наша Russia».
00.05 «Місія празорлівасці». Шматсерыйны фільм.
00.50 Нашы навіны.
01.05 Навіны спорту.

06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
06.10 «Міншчына».
06.20 «Раніца. Студыя добрага настрою».
08.30 Фільм «Перакладчыца». Расія.
10.05 Пяць гісторый.
10.55 «Танга ўтрох». Тэленавэла.
11.45 «Сіла прыцягнення». Серыял.
12.40 «Званая вячэра».
13.50 «Новыя падарожжы дылетанта».
14.20 «Далёкія сваякі».
14.40 «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
15.30 «Баец». Серыял.
16.50 «Сталічны футбол».
17.20 «Міншчына».
17.30 «Званая вячэра».
18.30 «Сіла прыцягнення». Серыял.
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.10 «СТБ-спорт».
20.15 «Добры вечар, маляня».
20.30 «Гаішнікі». Серыял.
21.40 «Аўтапанарама».
22.00 «Вайна. Вядомая і невядомая». «Дзеці вайны». Фільм сёмы.
22.55 «СТБ-спорт».
23.00 «Баец». Серыял.
23.55 «Надзвычайныя гісторыі».

06.55 «ЛАДная раніца».
07.55 Смачна з Барысам Бурдой.
08.15 Серыял «Тэрмінова ў нумар!».
09.05 У гэты дзень.
09.10 Гадзіна суду. Справы сямейныя.
10.05 Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
10.55 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
11.50 Хакей. Формула гульні.
12.20 Дэтэктыў «Справа была ў Гаўрылаўцы» (Расія).
13.10 Камедыйны серыял «Рака-мора» (Расія). 1-я серыя.
14.00 Мультфільм.
14.10 Мультсерыял «Галактычны футбол».
15.00 Пазакласная гадзіна.
15.15 Бітва экстрасэнсаў.
16.05 Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
17.00 Смачна з Барысам Бурдой.
17.35 Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
18.35 Навіны культуры.
18.50 Дэтэктыўны серыял «Тэрмінова ў нумар!» (Расія).
19.55 Беларуская часіна.
20.55 Калыханка.
21.15 Экспедыцыя.
21.20 Спорт-кадр.
21.50 Фантастычны баявік «Зорны дэсант» (ЗША).

### РОССИЯ

07.00 Добрай раніцы, Расія!
09.15 Тэлесерыял «Кармеліта».
10.10 Тэлесерыял «Тэрмінова ў нумар-2».
11.00 Весткі.
11.20 «Нічога асабістага». Інфармацыйнасатырычная праграма.
11.35 «Апошняя песня шпіка Экімяна». Дакументальны фільм.
12.25 Тэлесерыял «Лэдзі Мэр», 2001 г. Заключная серыя.
13.15 «Кулагін і партнёры».
13.50 Навіны - Беларусь.
14.00 Весткі.
14.20 «Арбацкія хлопчыкі». Дакументальны серыял. Фільм 1-ы.
14.55 Тэлесерыял «Трое супраць усіх-2».
15.50 Фільм «Зімовая вішня». 1995 г. 6-я серыя.
16.50 Навіны - Беларусь.
17.00 Весткі.
17.25 «Вандраванні натураліста».
17.55 «Трымай мяне мацней». Тэлесерыял.
18.50 Навіны - Беларусь.
19.00 Весткі.
19.30 Тэлесерыял «Кармеліта».
20.30 Тэлесерыял «Тэрмінова ў нумар-2».
21.30 Тэлесерыял «Трое супраць усіх-2».
22.35 «Кулагін і партнёры».
23.10 Навіны - Беларусь.
23.20 «Весткі+».
23.40 «Барыс Васільеў. Надзвычайны чалавек». Дакументальны фільм.
00.30 Заканчэнне эфіру.

### НТВ

06.00, 10.00, 13.00 Сёння.
06.05 Канал «Сёння раніцай».
09.00 «Праграма Максімум». Скандалы. Інтрыгі. Расследаванні.
10.25 «Чыстасардэчнае прызнанне».
10.55 «Жаночы погляд».
11.20 Серыял «Крывавы круг».
12.10 Баявік «Вікінг».
13.35 Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
15.10 «Ты не паверыш! Ньюс».
15.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.00 Сёння.
16.30 Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
18.25 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
19.00 Сёння.
19.35 Вострасюжэтны серыял «Захопнікі».
21.40 «Вочная стаўка».
22.35 Дэтэктыўны серыял «Версія».
23.00 Сёння.
23.20 Дэтэктыўны серыял «Версія».
23.50 Баявік «Вікінг».

### EUROSPORT

09.30 Матаспорт па выходных.
10.00 Экстрэмальны спорт. Лепшыя моманты.
11.00 Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 17 гадоў. Германія. Фінал.
12.45 Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
13.30 Снукер. Сусветная серыя ў Ірландыі. 2-і дзень.
15.00 Веласпорт. «Тур Італіі». 9-ы этап.
16.00 Веласпорт. «Тур Італіі». 10-ы этап. Прамая трансляцыя.
18.30 Футбол. Еўрагалы. Навіны.
18.45 Футбол. Класіка Лігі чэмпіёнаў УЕФА. Фіналы 2001 - 2008 гг.
19.45 Футбол. Класіка Лігі чэмпіёнаў УЕФА.
20.45 Футбол. Еўрагалы. Навіны.
21.00 Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
21.45 Футбол. Еўрагалы.
22.00 Бокс. Міжнародны паядынак у ЗША.
00.00 Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Часопіс.
00.30 Веласпорт. «Тур Італіі». 10-ы этап.
01.45 Футбол. Еўрагалы. Часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

18.00 Аб'ектыў.
18.10 «Элі Макбіл», тэлесерыял.
18.55 Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Розныя светы», дак. фільм, 2005 г., Славакія.
20.15 «Акно ў Еўропу».
20.40 Беларусы ў Польшчы.
21.00 Аб'ектыў (галоўнае выданне).
21.15 Хто ёсць кім?: Андрэй Такінданг: «...апрануўшы белую кашулю...».
21.35 Форум: Без права на жыццё.
22.20 Еўропа сёння.
22.50 Госць «Белсату».
23.05 «Элі Макбіл».
00.00 Аб'ектыў.

## 22 МАЯ, ПЯТНІЦА

### 1

**05.35** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.35** Сфера інтарэсаў.
**09.05, 13.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Дэтэктыўны серыял «Галоўны калібр» (Расія). Заключная серыя.
**10.00** Меладрама «Тэрыторыя прыгажосці» (Украіна). 4-я серыя.
**10.50** Меладраматычны серыял «Два бакі адной Ганны» (Украіна).
**11.40** Відэафільм АТН «Запаведныя сцежкі Лепельшчыны» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** Вострасюжэтны серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні» (ЗША).
**13.05** Камедыйны дэтэктыўны серыял «Монк» (ЗША).
**14.05** Шпілька.
**14.30** Камедыйны серыял «Офіс» (ЗША).
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**16.05** Меладраматычны серыял «Дзве сястры» (Расія). 3-я серыя.
**16.50** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё». «Мае браты і сёстры».
**18.05** Меладраматычны серыял «Два бакі адной Ганны» (Украіна).
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Канцэрт Аўрыл Лавін.
**21.00** Панарама.
**21.50** Фантастычны серыял «Зорны крэйсер «Галактыка» (ЗША-Вялікабрытанія).
**23.40** Драматычны трылер «У адзін бок» (Германія).
**01.45** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**10.05** Прэм'ера. «Шальны анёл». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.40** «Ералаш».
**12.05** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.45** «Хачу ведаць».
**15.10** «Гарачы лёд». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Прынцэса цырку». Шматсерыйны фільм.
**17.10** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Дакументальны дэтэктыў».
**19.00** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Вялікая розніца».
**22.10** Прэм'ера. Фільм «Лепшая пара году».
**01.10** «Наша Belarussia».
**01.40** Нашы навіны.
**01.55** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Гаішнікі». Серыял.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Дарагая перадача».
**10.55** «Танга ўтрох». Тэленавэла.
**11.45** «Сіла прыцягнення». Серыял.
**12.40** «Званая вячэра».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Добры дзень, доктар!».
**14.20** «Далёкія сваякі».
**14.40** «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
**15.30** «Баец. Нараджэнне легенды». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Асабісты інтарэс».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Сіла прыцягнення». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** Фільм «Банзай». Францыя, 1983 г.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Гарачы лёд».
**23.25** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.05** Фільм «Алмазныя сабакі». Канада-Кітай, 2007 г.

### ЛАД

**06.55** «ЛАДная раніца».
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.15** Дэтэктыўны серыял «Тэрмінова ў нумар!» (Расія).
**09.05** У гэты дзень.
**09.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.00** Час футболу.
**10.30** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**11.20** «Лабірынты: ключ ад Літвы».
**11.50** Дэтэктыў «Справа была ў Гаўрылаўцы-2» (Расія). 2-я серыя.
**12.40** Камедыйны серыял «Рака-мора» (Расія). 4-я серыя.
**13.30** Мультфільмы.
**14.10** Мультсерыял «Галактычны футбол» (Францыя). Заключныя серыі.
**15.05** Пазакласная гадзіна.
**15.15** Школа рамонту.
**16.10** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**17.05** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.35** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Усё аб бяспецы.
**19.20** Бітва экстрасэнсаў.
**20.30** Калыханка.
**20.50** Экспедыцыя.
**20.55** Камедыйная меладрама «Анатомія Грэй-4» (ЗША). Заключныя серыі.
**22.35** Хакей. НХЛ. Матч тыдня.

### РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.15** Тэлесерыял «Кармеліта».
**10.10** Тэлесерыял «Тэрмінова ў нумар-2», 2008 г.
**11.00** Весткі.
**11.25** «Здань чорнай смерці». Дакументальны фільм.
**12.20** «Трымай мяне мацней». Тэлесерыял.
**13.15** «Кулагін і партнёры».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Арбацкія хлопчыкі». Дакументальны серыял. Фільм 4-ы.
**14.35** Тэлесерыял «Трое супраць усіх-2».
**15.30** Фільм «Выбухнікі». 1970 г.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Гарадок». Дайджэст.
**17.55** «Трымай мяне мацней». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**21.05** Фільм «Каманадзіроўка». 2008 г.
**22.45** Навіны - Беларусь.
**22.55** Камедыя «Лэдзі на дзень». 2001 г.
**00.50** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**09.05** «Галоўны герой».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Рускія не здаюцца!».
**10.50** «Шнур вакол свету».
**11.20** Вострасюжэтны серыял «Крывавы круг».
**12.10** Баявік «Вікінг».
**13.00** Сёння.
**13.35** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**15.10** «Ты не паверыш! Ньюс».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** «Следства вялі...».
**20.35** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**20.55** Фільм «Дачніца».
**22.45** Камедыя «Школа нягоднікаў».
**00.30** Драма «Калібр 45».

### EUROSPORT

**09.30** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Італіі». Прэв'ю.
**10.00** Марафон. Марафон па пяску.
**10.30** Веласпорт. «Тур Італіі». 12-ы этап.
**11.55** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**12.00** Тэніс. Класіка. Парыж.
**13.00** Тэніс. Турнір WTA у Польшчы (Варшава). Паўфінал. Прамая трансляцыя.
**16.25** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**16.30** Веласпорт. «Тур Італіі». 13-ы этап. Прамая трансляцыя.
**18.30** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**18.45** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.00** Футбол. Класіка Лігі чэмпіёнаў УЕФА.
**20.00** «For the planet». Часопіс.
**20.30** Футбол. Кубак УЕФА. Жанчыны. Фінал. Прамая трансляцыя.
**22.30** Армрэстлінг. PAL/NAL.
**23.00** Покер. Турнір «Partouche» (Францыя).
**00.00** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Італіі». 1-ы дзень.
**00.30** «Формула-1». Часопіс.
**01.00** Футбол. Кубак УЕФА. Фінал.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**18.00** Аб'ектыў.
**18.10** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял.
**19.00** Праект «Будучыня».
**19.30** «Слуцкі збройны чын», дак. фільм, 2008 г.
**20.00** Без рэтушы: «Бізнес-партыя», рэпартаж, 2009 г., Польшча.
**20.25** Кружэлка (сусветная музыка).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Госць «Белсату».
**21.30** «Завадатар», маст. фільм, 1977 г., Польшча.
**23.15** «Апошні сезон», серыял.
**00.10** Аб'ектыў.

## 23 МАЯ, СУБОТА

### 1

**06.25** Моладзевы серыял «Сэрца акіяну» (Францыя).
**06.50** Брытва Окама.
**07.15** Існасць.
**07.45** Дзень спорту.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**08.45** Гатуем разам.
**09.00, 12.00, 15.00, 18.00** Навіны.
**09.05** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**09.35** Здароўе.
**10.05** Шпілька.
**10.40** Ранішняя хваля.
**11.15** «Off Stage Life».
**11.30** «Будні чэмпіёнаў».
**12.10, 15.30** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**12.20** Лірычная камедыя «Дайце кнігу скаргаў» (СССР).
**14.00** Дакументальны фільм «Жыццё як цуд. Эмір Кустурыца ў Мінску» (Беларускае тэлебачанне).
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.35** Вакол планеты.
**16.20** Гульнявое шоў «Інтуіцыя».
**17.20** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**17.45** Відэафільм АТН «Шэпт Столінскай багны» цыклу «Зямля беларуская».
**18.20** «Ваша лато».
**19.10** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.20** Меладрама «Чырвоны жэмчуг кахання» (Расія - Украіна).
**21.00** Панарама.
**21.45** Відэафільм АТН «Еўрабачанне-2009: за кадрам». Фільм 1-ы.
**22.10** Драма «Малая на мільён» (ЗША).
**00.40** Уласнай персонай.
**01.05** Чэмпіянат свету па аўтагонках «Формула-1». Гран-пры Манака. Кваліфікацыя.

### Н

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**09.35** «Здароўе».
**10.20** «Смак».
**11.00** Прэм'ера. «Шарль Азнавур. Жыццё ў каханні».
**11.55** «Самы апошні дзень».
**13.40** Тэлечасопіс «Саюз».
**14.10** «Кінаметры вайны».«Дзве зоркі. Іван».
**14.40** «Іван». Мастацкі фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Вялікая палітыка.
**16.50** Прэм'ера. «Ціхія світанні Барыса Васільева».
**17.50** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**18.45** «Ляці, мая песня». Юбілейны вечар.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Пражэктарпэрысхілтан».
**21.45** «Што?Дзе?Калі?».
**23.55** Рамантычная драма «Паждлівасць». ЗША, 2007 год.

### СТВ

**07.05** «Гарачы лёд».
**07.30** «Вовачка - 4». Камедыйны серыял.
**08.20** Фільм «Казкі старога чараўніка». СССР, 1984 г. 1-я серыя.
**09.35** «Я - вандроўца».
**10.00** «Крокі да поспеху».
**10.55** «Мінск і мінчане».
**11.30** «Каханне Маё». Камедыйны серыял.
**12.30** «Новыя падарожжы дылетанта».
**13.00** Фільм «Двое пад адным парасонам». СССР, 1983 г.
**14.40** «Дарагая перадача».
**15.05** «Рэальны спорт».
**15.20** «Ваенная таямніца».
**16.20** «Наша справа».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.40** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**17.20** «Нашы рэкорды».
**18.10** «Top Gear. Руская версія».
**19.00** «Малая Радзіма».
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** Фільм «Ганібал». ЗША-Вялікабрытанія, 2001 г.
**22.35** «Неюбілейны вечар. БІ-2».
**00.15** Фільм «Казанова Феліні». ЗША-Італія, 1976 г.
**02.40** Фільм «Аматары падглядваць». ЗША, 2001 г.

### ЛАД

**07.45** Дакументальна-пазнавальны серыял «Сардэчна запрашаем у маю краіну» (Францыя).
**08.10** Серыял для дзяцей «Філ з будучыні» (ЗША).
**09.00** Свая кампанія.
**10.05** Таемны госць.
**10.35** Жансавет.
**11.05** Школа рамонту.
**12.10** Невытлумачальна, але факт.
**13.05** «Лабірынты: прывіды старасвецкай Лошыцы».
**13.30** Запал па культуры. Ток-шоў.
**14.10** Жаночая ліга.
**14.35** «Касмапалітэн». Відэаверсія.
**15.35** Фантастычныя прыгоды «2001: Касмічная Адысея» (Вялікабрытанія - ЗША).
**17.50** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Шахцёр (Салігорск) - Дынама (Мінск). Прамая трансляцыя.
**19.55** Жаночая ліга.
**20.25** Гістарычны баявік «Чынгісхан. На край зямлі і мора» (Японія).
**23.00** Казанова.
**23.30** Трагікамедыя «Жах, які заўсёды з табой» (Расія).

### РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** Весткі.
**07.10** Фільм «У бабы брусніцы». «Незамужняя жонка». 1989 г.
**08.30** Мультфільм.
**08.50** «Суботнік».
**09.30** «Ранішняя пошта».
**10.05** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.15** «Пакой смеху».
**12.30** «Чарадзей». Дакументальны фільм.
**13.00** Дэтэктыў «Вяртанне Турэцкага». Фільм 9. «Кроўнік».1 серыя.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Андрэй Тупалеў». Дакументальны фільм.
**15.00** Прэм'ера. «Крывое люстэрка».
**17.00** Камедыя «Цімур і яго камандас». 2004 г.
**19.00** Весткі ў суботу.
**19.35** «Суботні вечар».
**21.25** Фільм «Без віны вінаватыя». 2008 г.
**00.25** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Казкі Бажэнава».
**08.45** Мультфільм.
**08.55** «Агляд».
**09.20** «Без рэцэпту».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Галоўная дарога».
**11.00** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.30** «Асоба небяспечны!».
**14.05** Фантастычны баявік «Прынцэса мячоў».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Жаночы погляд».
**17.05** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак. Аддзел аператыўных расследаванняў».
**19.00** Сёння.
**19.25** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.00** «Праграма Максімум». Скандалы. Інтрыгі. Расследаванні.
**21.05** «Рускія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**22.00** «Ты не паверыш!».
**23.00** Трылер «Цень страху».
**00.30** Крымінальная камедыя «Вялікі белы клопат».

### EUROSPORT

**09.30** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Італіі». 1-ы дзень.
**10.00** «Формула-1». Часопіс.
**10.30** «For the planet». Часопіс.
**11.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**11.15** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**11.30** «20 гадоў».
**12.30** Тэніс. Класіка. Парыж.
**14.00** Тэніс. Турнір WTA у Польшчы (Варшава). Фінал. Прамая трансляцыя.
**15.55** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**16.00** Веласпорт. «Тур Італіі». 14-ы этап. Прамая трансляцыя.
**18.30** Футбол. Кубак УЕФА. Жанчыны. Фінал.
**20.25** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**20.30** Конны спорт. Турнір «Global Champions» у Германіі (Гамбург).
**21.45** Бокс. Міжнародны паядынак у Францыі (Давіль).
**00.00** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Італіі». 2-і дзень.
**00.30** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**02.30** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Італіі». 2-і дзень.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**18.00** Аб'ектыў.
**18.10** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма).
**18.40** «Два-тры пытанні пра актывізм», дак. фільм, 2008 г., Румынія.
**19.40** «Права быць свабодным» – канцэрт альтэрнатыўнай музыкі на фестывалі Луцк-2007, ч. 4. выступ гуртоў «Уліс» і «Крама».
**20.10** На колах.
**20.40** YoLife! (моладзевая праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.10** Невядомая Беларусь. «Гуканне вясны», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**21.40** Еўропа сёння.
**22.10** Суботні сеанс. «Сміла – адчуванне снегу», маст. фільм, 1997 г., Данія–Германія–Швецыя.
**00.05** Аб'ектыў.

## 24 МАЯ, НЯДЗЕЛЯ

---

**07.30** Прыгодніцкі фільм «Выспа скарбаў» (СССР). Заключная серыя.
**08.30** Альманах вандраванняў.
**09.00, 12.00, 14.25** Навіны.
**09.05** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Арсенал.
**09.40** Культурныя людзі.
**10.15** Усе стыхіі.
**10.45** У свеце матораў.
**11.20** Дакументальны серыял «Таямніцы забытых перамог» (Расія).
**12.10** Камедыя «Жаніцьба Бальзамінава» (СССР).
**13.55** Nota Bene.
**14.35** Навіны рэгіёна.
**14.55** Чэмпіянат свету па аўтагонках «Формула-1». Гран-пры Манака. Гонка. Прамая трансляцыя.
**16.55** Фантастычны серыял «Паверхня» (ЗША).
**17.55** Суперлато.
**18.55** «Зорныя танцы».
**20.35** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**21.00** «Панарама тыдня».
**22.10** Відэафільм АТН «Еўрабачанне-2009: за кадрам». Фільм 2-і.
**23.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**23.05** Прэм'ера. Гістарычная драма «Гісторыя аб Трыстане і Ізольдзе» (ЗША-Вялікабрытанія-Германія-Чэхія).

---

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**09.50** «Шалапутныя нататкі».
**10.10** Пакуль усе дома.
**11.00** Фазэнда.
**11.35** «Разумніцы і разумнікі».
**12.20** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**13.05** «Зваротны адлік».
**13.35** Прэм'ера. «Любоў Палішчук. Жанчына-свята».
**14.30** Фільм «Калі можаш, прабач...».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Нядзельны «Ералаш».
**16.35** Прэм'ера. «Атручаныя рэўнасцю».
**17.25** Камедыя «Смокінг па-разанску». Расія, 2007.
**19.10** АНТ прадстаўляе: «Рэкламная паўза».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**21.40** Прэм'ера. Фільм «Кароль Каліфорніі».
**23.25** «Камедзі Клаб».
**00.05-02.00** Прэм'ера. Фільм «Рэмба-4».

---

**06.40** «Праверана на сабе».
**07.25** «Вовачка - 4». Камедыйны серыял.
**07.50** Фільм «Банзай». Францыя, 1983 г.
**09.30** «Добры дзень, доктар!».
**10.00** Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.55** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Каханне Маё». Камедыйны серыял.
**12.30** «Аўтапанарама».
**13.00** Фільм «Небяспечныя гастролі». СССР, 1969 г.
**14.35** «Дарагая перадача».
**15.00** «Культурнае жыццё».
**15.30** «Прыватныя гісторыі».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэтраманія».
**18.00** «Фантастычныя гісторыі».
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.30** Фільм «Чатыры пакоі». ЗША, 1995 г.
**22.20** «Спартыўны тыдзень».
**22.40** «Прафесійны бокс».
**23.35** «Агенцтва «Залатая куля». Серыял.

---

**08.10** Дабравест.
**08.35** Мір вашай хаце.
**08.50** Бухта капітанаў.
**09.30** Наша пяцёрачка.
**10.00** Мультфільм.
**10.10** Прэм'ера! «Конг: вяртанне ў джунглі». Прыгоды для ўсёй сям'і (Вялікабрытанія).
**11.30** Медычныя таямніцы.
**12.10** Сезон ля дачы.
**12.50** Пасоўванне+.
**13.05** Гаспадар.
**13.35** Камедыйны серыял «Дурнушка Бэці» (ЗША).
**15.55** Гандбол. Чэмпіянат Беларусі. Матч зорак. Прамая трансляцыя.
**17.30** Жаночая ліга.
**17.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Матч тура. Прамая трансляцыя.
**19.55** Слова пісьменніка.
**20.25** Тэлебарометр.
**20.45** Экспедыцыя.
**21.15** Авантурная меладрама «Добрая жанчына» (Вялікабрытанія-Італія-ЗША).
**23.05** «Правы чалавека».
**23.20** Свая музыка.
**23.50** Пасоўванне+.

---

**РОССИЯ**

**07.00** «Здабытак рэспублікі».
**07.25** Фільм «У бары брусніцы». «Ягоравы». 1989 г.
**08.45** Камедыя «Душачка». 1966 г.
**10.10** «Смехапанарама».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.00** «Пугачова, Распуціна... Усе зоркі Дзербенёва». Дакументальны фільм.
**13.00** Дэтэктыў «Вяртанне Турэцкага». Фільм 9. «Кроўнік». 2 серыя.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Аляксандр Парахаўшчыкоў». Дакументальны фільм.
**15.25** «Сумленны дэтэктыў».
**16.00** «Танцы з Зоркамі». Сезон-2009.
**19.00** Весткі тыдня.
**20.05** «Адмысловы карэспандэнт».
**20.30** Фільм «Халоднае сонца». 2008 г.
**22.40** Дэтэктыў «Усе павінны памерці». 2007 г.
**00.55** Заканчэнне эфіру.

---

**НТВ**

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.15** «Дзікі свет».
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Выратавальнікі».
**10.50** «Прафесія-рэпарцёр».
**11.20** «Авіятары».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Крамлёўскія пахаванні».
**14.10** Драма «Клетка для трусаў».
**16.00** Сёння.
**16.30** «Барацьба за ўласнасць».
**17.05** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак. Злачынны намер».
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**19.50** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.30** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**21.05** «Галоўны герой».
**22.15** Фантастычны баявік «Крумкач-3: выратаванне».
**00.10** «Футбольная ноч».

---

**EUROSPORT**

**09.30** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Італіі». 2-і дзень.
**10.00** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**10.05** Веласпорт. «Тур Італіі». 14-ы этап.
**10.45** Аўтагонкі. Суперкубак Паршэ ў Манака. Прамая трансляцыя.
**11.30** «Формула-1». Часопіс.
**12.00** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Францыі (Парыж). 1-ы дзень. Прамая трансляцыя.
**17.00** Веласпорт. «Тур Італіі». 15-ы этап. Прамая трансляцыя.
**18.25** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**18.30** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Францыі (Парыж). 1-ы дзень. Прамая трансляцыя.
**21.30** Тэніс. «Гейм, сэт і матч». Часопіс. Прамая трансляцыя.
**21.55** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**22.00** Снукер. Зала славы.
**23.15** Матаспорт па выходных.
**23.30** Аўтагонкі. Сусветная серыя Рэно ў Манака.
**00.00** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Італіі». 3-і дзень.
**00.30** Тэніс. Турнір «Вялікага шалома». Адкрыты чэмпіянат Францыі (Парыж). 1-ы дзень.
**01.30** Тэніс. «Гейм, сэт і матч». Часопіс.
**02.00** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Італіі». 3-і дзень.

---

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**18.00** Прэс-экспрэс.
**18.15** «Ранча», серыял.
**19.05** «Бульбаны», мультсерыял.
**19.10** «Маці знядоленых», дак. фільм, 2005 г., Італія.
**20.10** Форум (ток-шоу): Шлюб па разліку.
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня).
**21.20** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Кім была Еўфрасіння Полацкая?».
**21.25** «Акно ў Еўропу».
**21.50** Фільматэка майстроў: «Мастацтва плакаць», маст. фільм, 2006 г., Данія.
**23.35** Фестываль «Be Free–2008», ч. 3: выступы гуртоў «Ху4» і «IQ48».
**00.05** Аб'ектыў.

---

# ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску на 2009 год. Падпісацца на выданне можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

### Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

Министерство связи и информатизации
Республики Беларусь
№ ____________ (по реестру ф. 11)
№ ____________ (по реестру ф. 10)

ИСПРАВЛЕНИЯ НЕ ДОПУСКАЮТСЯ

ПРИЕМ

Предоплата за доставку г-ты "Новы час"

| Наименование предприятия связи, к - гербовая печать | Календарный шт. места подачи | № по ф. 5 | Сумма, вид услуги, подпись оператора |
|---|---|---|---|
| | | | |

ПОЧТОВЫЙ ПЕРЕВОД на ____________________ руб.

____________________ (сумма прописью)

Кому Куда Г-та "Новы час", р/с 3012211080010 фил. МГДОАО "Белинвестбанк", код 153001764, УНН 190790926 г. Минск, ул. Коллекторная,11

От кого ____________________

Адрес ____________________ (почтовый индекс и подробный адрес)

### Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у адзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

ИЗВЕЩЕНИЕ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926
(фамилия, имя, отчество, адрес)
Вид платежа | Дата | Сумма
Период подписки указывает абонент
Плательщик
Пеня
Всего
Кассир

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926
(фамилия, имя, отчество, адрес)
Вид платежа | Дата | Сумма
Период подписки указывает абонент
Плательщик
Пеня
Всего
Кассир

КІНО

# ГЛЯДЗЕЦЬ НЕЛЬГА ЗАБАРАНІЦЬ

Іван БІЧ

**У 2006 годзе беларускія ўлады па просьбах царквы знялі з пракату фільм «Код Да Вінчы» рэжысёра Рона Ховарда па матывах рамана Джона Браўна. Ці чакае той жа лёс новы фільм «Анёлы і дэманы», які выйшаў у пракат 6 мая?**




Стваральнікі стужкі нават не хаваюць, што маюць намер працягваць эксплуатаваць залатую жылу, якую адкрылі. Гаворка вядзецца пра шакуючую рэвізію традыцыйных поглядаў на гісторыю царквы. Фабула «Кода Да Вінчы» — вайна Касцёла з нашчадкамі Ісуса Хрыста, які быццам ажаніўся з Марыяй Магдаленай і меў ад яе дзіця.

«Анёлы і дэманы» працягваюць лінію. Галоўным героем зноў з'яўляецца гарвардскі прафесар Роберт Лангдон, якога грае Том Хэнкс. Да яго звяртаецца па дапамогу Еўрапейская арганізацыя ядзерных даследаванняў. Яе супрацоўнік быў забіты пры загадкавых абставінах. Забойства, як высвятляе навуковец, нейкім чынам звязана з ордэнам ілюмінатаў.

Ілюмінаты сапраўды калісьці існавалі: некалькі тайных груповак XVII–XVIII стагоддзя. У 1650 годзе ў Рыме была раскрытая змова праціўнікаў Папы. Яе касцяк складалі вучоныя, якія лічылі, што царква тармозіць навуковы працэс, не дае людзям даведацца праўду. Іх называлі ілюмінаты (ад лацінскага illuminati — «прасветленыя», «тыя, хто нясе святло»). Нягледзячы на рэпрэсіі, некаторым сябрам арганізацыі пашанцавала збегчы за мяжу, дзе яны працягнулі сваю дзейнасць.

Апісаны фрагмент гісторыі ілюмінатаў — гэта ў большай ступені легенда. Дакладна, аднак, вядома, што ў 1776 годзе ў Баварыі быў заснаваны ордэн ілюмінатаў, што займаўся прапагандай ідэі дасканаласці чалавека, якому быццам не патрэбныя ні рэлігія, ні дзяржава.

Цікава, што заснавальнік ордэна быў калісьці езуітам і, магчыма, папросту хацеў адпомсціць Папе за забарону ў 1773 годзе ордэна езуітаў.

Пасля таго, як у ордэн уступіў адзін нямецкі князь, быць ілюмінатам стала вельмі модна ў арыстакратычных салонах. Ілюмінатам лічыўся, напрыклад, Гётэ. Аднак праз некаторы час сябры ордэну перасварыліся. Сам заснавальнік Вейсгаупт апынуўся ў цэнтры скандалу (ад яго зацяжарала стрыечная сястра). Між тым, незадаволеныя дыктатам заснавальніка шараговыя ілюмінаты данеслі пра канспіратыўную групу ўладам. Баварскі ўрад ордэн забараніў, а сам Вейсгаупт збег за мяжу, дзе і памёр у 1830 годзе.

Аднак да гэтага часу ўжо адбылася Вялікая французская рэвалюцыя, і шматлікія кансерватыўныя гісторыкі ў пошуках яе прычын прапанавалі версію тайнай змовы. Нібыта сакрэтныя арганізацыі, у шэраг якіх уваходзілі ілюмінаты, правакавалі народны выбух і падзенне дынастыі. Увогуле, іх канчатковай мэтай было стварэнне сусветнага ўраду.

З тых часоў спекуляцыі вакол тэорыі змовы ніколі не прыпыняліся. Ілюмінатам нават прыпісвалі стварэнне ЗША (на гербе ЗША сапраўды выява вока — знак ілюмінататаў) і нават арганізацыю Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Расіі.

Цікава, што ў 1896 годзе ў Дрэздэне ордэн быццам быў адноўлены. На цяперашні дзень некалькі груповак называюць сябе ілюмінатамі.

Таямнічы і загадкавы імідж ордэну актыўна эксплуатаваўся і эксплуатуецца ў масавай культуры. Ілюмінаты — героі шматлікіх мастацкіх твораў, фільмаў і нават кампутарных гульняў.







Вось з якімі людзьмі давודзіцца змагацца нашаму прафесару Лангдону. Яны задумалі ні больш ні менш — узарваць рэзідэнцыю Папы ў Ватыкане. Зрабіць гэта яны збіраюцца з дапамогай рэчыва, якое было вынайдзена фізікамі-атамшчыкамі. Усё, што звязана з фізікай, — самая слабая частка. Затое яна кампенсуецца добрай фабулай і цудоўным апісаннем археалагічных помнікаў Рыму. Фактычна гэта цікавы турыстычны гід па вечнаму гораду.

Як і трэба было чакаць, Ватыкан не ў захапленні ад экранізацыі трызненняў Джона Браўна. Тым больш царкоўнікаў ужо пачалі даставаць турысты, якія ходзяць па будынках храмаў толькі для таго, каб пабачыць месцы здымак сцэнаў «Анёлаў і дэманаў».

Але старшыня Амерыканскай каталіцкай лігі не заклікаў да байкоту стужкі, як гэта было, калі на экраны выйшаў «Код Да Вінчы». Цяпер ён папрасту прапанаваў сябрам грамады інфармаваць адзін аднаго пра наяўнасць антыкаталіцкіх сэнтыментаў у фільме. Дасюль не зразумелая канчатковая ацэнка фільму з боку Святога прастолу. Галоўная газета Ватыкана *«L'Osservatore Romano»* напісала, што Касцёл «не ўхваляе фільм». Між тым, папулярная італьянская газета *«La Stampa»* сцвярджае, што Папа абавязкова выступіць з заклікам байкоту карціны.

З іншага боку, цяжка не пагадзіцца са словамі архіепіскапа Веласіа дэ Паолі, які лічыць, што заклік да байкоту хутчэй стане дадатковай рэкламай. Менавіта так было тры гады таму, калі ў кінатэатрах пачалі паказваць «Код Да Вінчы». У Індыі, Пакістане, Іардане, Егіпце, Беларусі фільм забаранілі. Ордэн *Opus Dei* (менавіта яго сябры ў фільме — галоўныя ворагі Лангдона) выступіў з пратэстам. З-за шуміхі цікавасць да стужкі была папросту шалёнай. Фільм, на здымкі якога пайшло 77 мільёнаў долараў, прынёс ягоным стваральнікам больш за 7 мільярдаў прыбытку. Па ўсяму свету карціну паглядзелі прыкладна 300 мільёнаў чалавек. Прычым з пункту гледжання мастацтва «Код Да Вінчы» быў вельмі слабы. На сайце *Rotten Tomatoes* (гнілыя таматы), што абірае самы горшы фільм, 25 працэнтаў наведвальнікаў, якія давалі ацэнку карціне, заявілі, што не супраць запусціць у аўтараў карціны «гнілым памідорам». Наўрад ці новы твор Рона Ховарда якасна лепшы.

Так ці інакш, кіношнікі разлічваюць на вялікія прыбыткі. Інакш яны б не заплацілі Тому Хэнксу самы вялікі ганарар у гісторыі: прыкладна 50 мільёнаў долараў.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Калі гэта («Усходняе партнёрства») не паход на Усход, то што гэта? Ну а што казалі самі запрошаныя да супрацоўніцтва ў рамках «Усходняга партнёрства»? Асноўным для кіраўнікоў дзяржаваў з'яўляюцца не еўрапейскія стандарты, а куды больш прагматычныя мэты, якія, на іх думку, цалкам дасягальныя. Найбольш адкрыта казалі пра гэта ўкраінскі і беларускі прэзідэнты ў Гомелі… Украінскі прэзідэнт адзначыў важнасць украінска-беларускіх кантактаў з той мэтаю, каб высвятляць, «як развіваць праекты, каб атрымаць больш фінансавання з бюджэту ЕС. Мы ў гэтым пытанні вялікія партнёры». Тое ж казаў беларускі калега... А 9 мая Аляксандр Лукашэнка, які не паехаў у Прагу, у сваім стылі адзначыў: «Там (ва «Усходнім партнёрстве») няма ніякай палітыкі… Пры чым тут правы чалавека і дэмакратыя? Як гэта тычыцца нафты і газу?»

**«Фонд эффективной политики» (Расія)**

Дзякуючы *Turkcell* (турэцкая фірма, уладальнік кампаніі *«Life»*, якая прадала частку акцый шведскай дзяржаўнай фірме) Швецыя не ўключаецца ў супрацоўніцтва з дыктатурай і такім чынам пазбаўляецца адказнасці за гэта. І тым не менш, фактычна яна супрацоўнічае з рэжымам Лукашэнкі. Шведскія аглядальнікі папераджаюць сваіх падаткаплацельшчыкаў пра тое, што іх грошы могуць пайсці на падтрымку недэмакратычнага рэжыму ў Беларусі.

**«Svenska Dagbladet» (Швецыя)**

Другая магчымасць для ЕС заключаецца ў тым, што ён мог бы ўзяць быка за рогі і сур'ёзна інвеставаць у гульню супраць Расіі. У палітыкі сфер уплываў ёсць свае пагрозы. Збалансаваць каштоўнасці і інтарэсы для ідэалістычных фармацый кшталту ЕС будзе нялёгкай задачай. Аднак усё складаецца не так чорнабела, як здаецца. Гэта дэманструе падтрымка беларускай апазіцыяй спроб ЕС палепшыць адносіны з Мінскам, якая разумее, што на кану незалежнасць дзяржавы.

**«Postimees» (Эстонія)**

У Мінску назіраюцца аптымістычная настроі адносна «Усходняга партнёрства», сяброўства ў якім лічыцца заканамерным і пазітыўным працэсам, што гарантуе стабільнасць цяпер і надзею на будучае рэспублікі ў рамках самай канкурэнтназдольнай і дынамічнай зоны свету. Аднак сярод прадстаўнікоў дзяржаўна-палітычнай эліты РБ адчуваецца незадаволенасць тым, што Еўрасаюз з самага пачатку па-рознаму ставіцца да сяброў шасцёркі: палітычны фармат прывілеяванага партнёрства надаецца адным удзельнікам праграмы за кошт іншых, і перш за ўсё Беларусі. Што тычыцца палітычных патрабаванняў ЕС да беларускага рэжыму, то сам кіруючы клас намагаецца пра гэта не казаць. Здаецца, што прэзідэнцкая адміністрацыя і ўрад РБ дрэнна ўяўляюць наступствы для сябе сяброўства ва «Усходнім партнёрстве».

**«Материк» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### БАЛІВІЯ. РАСКРЫТАЯ ЗМОВА СЕПАРАТЫСТАЎ




У мілую пятніцу 8 мая ў балівійскай правінцыі Санта-Круз падчас спробы продажу цяжкой зброі органамі бяспекі былі затрыманы два чалавекі. Высветлілася, што адзін з іх звязаны са спонсарамі руху за аўтаномію правінцыі Санта-Круз (багатая правінцыя на ўсходзе Балівіі, урад якой выступае супраць сацыялістычнага курсу прэзідэнта Эва Маралеса). Гэты факт даў падставу атачэнню Маралеса казаць пра наяўнасць змовы супраць прэзідэнта. Прааналізаваўшы спіс апошніх сустрэч гандляра зброяй, паліцыя Балівіі ўзялася за галаву. Аказалася, што яго офіс наведалі і прадстаўнікі еўрапейскага руху правых сепаратыстаў, былыя байцы харвацкай арміі, якая змагалася за незалежнасць. Засвяціўся ў Балівіі і кіраўнік арганізацыі Logia Secuiesti (LS), якая выступае за выхад са складу Румыніі часткі краіны, якая да першай сусветнай належала Венгрыі. Размовы сепаратыстаў Еўропы і Санта-Круз датычыліся галоўным чынам праекту стварэння фірмы для аховы бізнесу, аднак ва ўладаў свая версія: у Санта-Круз рыхтуецца ваенны пераварот.

**По матэрыялах «Junge Welt» (Германія)**



### ГЕРМАНІЯ. ШТО РАБІЦЬ З ПЕЙНТБОЛАМ?

У ФРГ працягваецца грамадская палеміка наконт забароны пейнтболу (гульня, удзельнікі якой страляюць фарбамі). Прычына — мілітарысцкая сутнасць забавы, якая ўздымае цікавасць да гвалту. Хлопец, які нядаўна забіў у адной з нямецкіх школ групу вучняў, быў, як высветліла следства, заўзятым фанатам пейнтболу. На думку псіхолагаў, гульня падштурхнула яго да таго, каб страляць па людзях не фарбай, а кулямі. Ініцыятыва забароны гульні выклікала гучныя пратэсты з боку яе аматараў. Нямецкая ліга пейнтболу налічвае 100 тысяч сяброў. Штогод яны праводзяць 1700 турніраў. Каб не дапусціць забароны, кіраўніцтва лігі не выключае нават магчымасці стварэння палітычнай партыі (папярэдняя назва *«Pro-Paintballsport»*). Цікава, што аргкамітэт *«Pro-Paintballsport»* актыўна прыцягвае на свой бок фанатаў кампутарных гульняў. Яны лічаць, што ўрад пасля забароны пейнтболу можа ўзяцца за любую імітацыйную гульню, дзе прысутнічае гвалт.

**По матэрыялах «Tageszeitung» (Германія)**

### ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ. ПАМЁР ЛЕГЕНДА РАБОЧАГА РУХУ

5 мая ва ўзросце 96 гадоў памёр легенда брытанскага працоўнага руху. Яго звалі Джэк Джонс. У Джэка проста фантастычная біяграфія. Ён нарадзіўся ў Ліверпулі ў 1913 годзе. У 1930-я гады як баец Інтэрнацыянальных брыгад ён змагаўся з франкістамі ў Іспаніі. У сваім родным горадзе Джэк меў рэпутацыю самага радыкальнага антыфашыста, які неаднаразова збіваў сяброў Брытанскага фашысцкага саюзу Эдварда メслі. Перад пачаткам другой сусветнай вайны стаў дэпутатам гарадскога савета ад партыі лейбарыстаў. Аднак зеніт кар'еры Джонса прыйшоўся на 1970-я, калі ён стаў старшынёй уплывовага Прафсаюза працаўнікоў транспарту (TGWU). Прафсаюз сваімі стачкамі паставіў тагачасны лейбарысцкі ўрад на калені. Адпаведна апытанням агенцтва *Gallup* у 1977 годзе, брытанцы лічылі, што таварыш Джонс мае больш улады, чым тагачасны прэм'ер-міністр краіны. Пасля выхаду з кіраўніцтва прафсаюзаў Джэк склаў мандат дэпутата парламента і прысвяціў рэшту свайго жыцця барацьбе за правы пенсіянераў. «Гэта быў просты чалавек, які скарыстаўся жыццём для таго, каб дапамагаць простым людзям», — сказаў пра нябожчыка былы лідэр лейбарыстаў Нэйл Кінак.

**По матэрыялах «Morning Star» (Вялікабрытанія)**



ЦІКАВА

# «РОЗБРАТ» ЗАСТАЕЦЦА

*Алег ПЯТРОЎ*

**Адна з самых незвычайных дэманстрацый у цяперашняй Польшчы адбылася 9 мая ў Познані. Прыкладна дзве тысячы чалавек выйшлі на вуліцу, каб пратэставаць супраць ліквідацыі праекту «Розбрат» (Rozbrat).**




Удзельнікі маніфестацыі ў падтрымку праекта ўяўлялі сабой дзіўны кангламерат сяброў розных партый і ініцыятываў, якія ў паўсядзённым жыцці часам ставяцца адзін да аднаго вельмі варожа. Напрыклад, у калоне крочылі побач сябры прафсаюза «Салідарнасць» і прафсаюза, які ў часы камуны выконваў функцыі «прываднога рамяня партыі». Акрамя таго тут можна было пабачыць анархістаў, краязнаўцаў з клубу «Мы з Познані!», эколагаў, артыстаў, трацкістаў, актывістаў руху за правы арандатараў жылля, зялёных і нават іншаземцаў, якія прыехалі ў Познань спецыяльна для таго, каб падтрымаць «Розбрат».

Увесь сыр-бор з-за некалькіх баракаў. Дакладней, комплексу баракаў, збудаваных пасля вайны, якія месцяцца на вуліцы Казіміра Пуляўскага. У часы саветаў (або камуны, як кажуць палякі) яны належалі аднаму гандлёваму ведамству. Пасля прыходу дэмакратыі з-за крызісу былы ўладар забыўся пра іх. Тым больш, што пра свае правы на зону заявілі нашчадкі тых, каму гэтая тэрыторыя належала да другой сусветнай вайны.

У 1994 годзе група культурных актывістаў заняла адзін з тых баракаў. Яны адрамантавалі дах, паставілі вокны. У ноч з 15 на 16 кастрычніка 1994 года новыя жыхары святочна абвясцілі пра пачатак працы свайго праекту.

Спачатку навасёлы бачылі «Розбрат» як камуну: яны тут жылі, разам снедалі, разам рамантавалі пакоі, працавалі ў створаным кааператыве, які назвалі *«Kolektyw Rozbrat»*.

Уладам на той час хапала іншых спраў, чым займацца баракам на Пуляўскага, тым больш, што ліквідаваць «Розбрат» было не вельмі этычна: падобныя сквоты (так называюць на Захадзе захопленыя жыллёвыя прасторы) у дэмакратаў прызыву часоў «Салідарнасці» лічыліся інстытутам дэмакратычнага грамадства.

Навіна пра «Розбрат» паступлова зацікавіла іншую моладзь. Спачатку прыйшлі эколагі. У адным бараку стала цесна. Давялося акупаваць іншыя. Новыя памяшканні сталі больш функцыянальнымі. Адзін будынак, напрыклад, адвялі пад канцэртную залу.

У той жа час у «Розбрат» перабраліся музыкі. Сваімі канцэртамі яны ператварылі яго ў своеасаблівы еўрапейскі цэнтр маладой музычнай культуры (каб выступіць у «Розбраце» музыкі прыязджалі нават з ЗША). Хутка «Розбрат» ператварыўся ў клуб панк-культуры, што аўтаматычна прыцягнула сюды неафашыстаў — заклятых праціўнікаў панкаў.

У лютым 1996-га карычневыя атакавалі «Розбрат». 12 чалавек са значкамі свастыкі нішчылі ўсё, што траплялася ім пад руку. Адну з дзяўчын, якая начавала ў бараку, ударылі нажом. Пасля чаго нападнікі збеглі. Справа мела вялікі рэзананс: на «Розбрат» прыехалі журналісты, паліцыя, супрацоўнікі пракуратуры. Інтарэс уладаў да праекту прымусіў шматлікіх піянераў «Розбрату» сысці жыць у нармальных кватэры.

Гэта паспрыяла змене канцэпцыі праекту. Было вырашана адмовіцца ад мадэлі камуны і зрабіць на базе сквоту незалежны культурны цэнтр.

Такая формула аказалася паспяховай. Сёння слова «Розбрат» вядома кожнаму маладому чалавеку ва Усходняй Еўропе, які прытрымліваецца альтэрнатыўных поглядаў. «Мілым акцэнтам Познані» назваў «Розбрат» адзін з мясцовых журналістаў. Сквот «Розбрат» значыць вельмі шмат і для маладых беларускіх музыкаў і літаратараў, якія часта там выступаюць. Тут, дарэчы, адбываўся адмысловы культурны фестываль, прысвечаны Беларусі.

Аднак «Розбрат» — гэта не толькі тэатр, канцэрты, выставы, чытанні, мастацкая галерэя, бясплатныя курсы адукацыі і таксама бясплатны інтэрнэт-клуб. Гэта пульс грамадскага жыцця сталіцы ваяводства Вялікая Польшча.

Сёння на базе «Розбрата» працуе шэраг грамадскіх ініцыятыў — ад краязнаўчых да праваабарончых. У 1997 годзе анархісты адчынілі на «Розбраце» нешта накшталт вольнага універсітэта. Лекцыі тут чытаюць такія вядомыя асобы, як заснавальнік прафсаюзу «Салідарнасць» Анджэй Гвязда.

Аднак па ходу таго, як «Розбрат» ператвараўся ў культурны феномен, ён усё больш цікавіў гандляроў нерухомасцю (вуліца Пуляўскага — гэта амаль цэнтр). Нехта, напрыклад, прапанаваў пабудаваць тут вілу класу люкс. Адпаведна нядаўна прынятаму плану рэканструкцыі цэнтра горада, «Розбрат» павінен быць ліквідаваны.

Заклікаючы захаваць «Розбрат», прыхільнікі праекту, безумоўна, спасылаюцца на прыклад Хрысціяніі. Хрысціянія — раён у Капенгагене, захоплены напрыканцы 1960-х моладдзю. У 1989 годзе гэты гарадок хіпі атрымаў аўтаномію. З часам ён стаў адным з цэнтраў моладзевага турызму, які прыносіць у бюджэт горада шалёныя грошы.

Ці атрымаецца паўтарыць нешта падобнае ва Усходняй Еўропе? Калі не атрымаецца, будзе сапраўды шкада. Цяжка не пагадзіцца са словамі аднаго з удзельнікаў маніфестацыі 9 мая: «Розбрат» — гэта тое, што робіць Познань не падобнай на іншыя гарады».

Дэманстрацыя ў абарону сквоту закончылася на адной з гістарычных вуліц Познані, дзе сёння ніхто не жыве. Усіх жыхароў выселілі з іх кватэр, паколькі тут плануецца пабудаваць новыя дарагія апартаменты і офісы. Маніфестанты на знак доказу рашучасці сваіх намераў захаваць «Розбрат» сімвалічна захапілі адзін з тых пустых будынкаў.

МЕРКАВАННЕ

# ЗА БЛОГ — У ТУРМУ

**Ніжняя палата казахскага парламента ўсё ж прыняла папраўкі да закону аб СМІ. Адпаведна ім, дзённік у Жывым журнале будзе цяпер разглядацца як звычайны СМІ з усімі прававымі наступствамі для ягонага аўтара. Пра закон аб СМІ і свабоду інтэрнэт-выданняў у Казахстане журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з казахскім журналістам Андрэем Грышыным.**




***— Наколькі развітая ў Казахстане блогасфера, наколькі модна ўдзельнічаць у інтэрнэт-форумах? Ці ставяць сябе блогеры, як, напрыклад, у Беларусі, у апазіцыю рэжыму? Які прававы статус у незалежных СМІ ў інтэрнэце?***

— З прававым статусам інтэрнэт-выданняў сітуацыя супярэчлівая. У нас няма зразумелых законаў, і таму некаторыя выданні, якія хацелі б мець правы СМІ, ідуць на рэгістрацыю. Іншыя працуюць так, як лічаць патрэбным. Аднак пры неабходнасці адсутнасць заканадаўства дазваляе іх лёгка штрафаваць або папросту блакаваць. Незадавальненне ўладай часцей праяўляюць інтэрнэт-выданні, а не самі блогеры. Сапраўднага палітычнага блогерства ў нас яшчэ няма. За выключэннем блога Рахата Аліева (былы зяць Назарбаева, які пасварыўся з цесцем і збег у Аўстрыю), ніводны іншы блог або чат не выклікае асаблівых праблемаў.

Што тычыцца блогаў і чатаў — усё гэта дастаткова папулярна, аднак трэба звярнуць увагу на тое, што доступ у інтэрнэт маюць максімум 10 працэнтаў жыхароў Казахстану. На ўрадавым узроўні нават спрабуюць зрабіць папулярным вядзенне блогаў (першым з палітыкаў блог завёў прэм'ер-міністр, а за ім па традыцыі пацягнуліся кіраўнікі гарвыканкамаў і губернатары. Праўда, калі блог кіраўніка ўраду рэгулярна абнаўляецца, і нават нехта адказвае на пытанні наведвальнікаў, то астатнія папросту абмяжоўваюцца стварэннем блога, а потым пра яго забываюць.

***— Як даўно і якімі сродкамі ўлады краіны пачалі кантраляваць інтэрнэт?***

— Кантроль вядзецца даўно. Ужо 10 гадоў прайшло пасля таго, як з'явіўся першы апазіцыйны сайт былога прэм'ера Акежана Кажэгельдзіна. Паколькі заканадаўствам кантроль за інтэрнэтам не даручаны канкрэтнаму дзяржаўнаму органу, інтэрнэтам займаецца шмат ведамстваў: Камітэт нацыянальнай бяспекі, Адміністрацыя прэзідэнта, пракуратура (у залежнасці ад таго, па чыіх інтарэсах б'е інфармацыя). Акрамя таго, 5–6 гадоў таму ў краіне з'явіўся Біллінг-цэнтр. Пра тое, чым ён канкрэтна займаецца, ведома няшмат, аднак у яго задачы тасама ўваходзіць сачыць за тэлефоннымі перамовамі і кантраляваць інтэрнэт.

Як непасрэдна кантралюецца сеціва — загадка. Аднак раней ужывалі блакіроўку на тэрыторыі Казахстану, выцісканне з зоны *kz* (цяпер усе даўно адсюль сышлі), адабранне ў выдання імя. Апошнім часам пракуратура ў першы раз нечакана папярэдзіла сайты пра тое, што не павінны з'яўляцца каментары, якія распальваюць міжнацыянальныя канфлікты. У выніку адзін сайт *posit* за такія каментары быў вымушаны па рашэнню пракуратуры часова прыпыніць працу. Пасля гэтага ўсе задумаліся і перагледзелі сваю палітыку размяшчэння каментараў.

***— Якая сітуацыя са свабодай інтэрнэта ў іншых краінах Цэнтральнай Азіі?***

— Цэнтральная Азія — вялікая, і ў кожнай краіне ёсць свае метады. У Туркменістане ўсяго дзесяць сайтаў на ўсю краіну. Інтэрнэт там даступны выключна некаторым юрыдычным асобам. Ва Узбекістане за прагляд апазіцыйнага сайта можна трапіць у турму. У іншых не ўсё так дрэнна, хаця Таджыкістан, Кіргізія і Казахстан усё роўна рухаюцца ў бок абмежавання інтэрнэту. Аднак Казахстан, здаецца, абышоў таджыкаў і кіргізаў, калі на заканадаўчым узроўні вырашыў кантраляваць блогасферу і чаты.

***— Як самі ўлады тлумачаць гэты крок?***

— Натуральна, клопатам пра інфармацыйную бяспеку, абаронай правоў грамадзян ад хуліганаў з сеці, роўнасцю правоў блогераў і журналістаў. Такім чынам, блогеры, як і журналісты, атрымліваюць некаторыя правы, аднак ці патрэбныя яны блогерам? Увогуле, ідэя абмежавання блогерства ўзнікла, як толькі Рахат Аліеў, якому надакучыла абараняць свой сайт ад атак хакераў, папросту завёў сабе блог у ЖЖ. Народ у прынцыпе разумее, адкуль ногі растуць у новага закона.

***— Якім будзе механізм пошуку і пакарання парушальнікаў закону? І хто будзе праглядаць блогі і чаты?***

— Цяжка сказаць. Спачатку планавалася, што такія функцыі возьме на сябе пракуратура. Аднак зараз дэпутаты вырашылі адмовіць пракуратуры ў правах зачыняць сайты. Думаю, што ўсё будзе працаваць па прынцыпу, які быў раней: у каго што баліць, той і будзе гэта праглядаць.

***— Якая рэакцыя грамадства, апазіцыі і саміх блогераў?***

— А якая можа быць рэакцыя на відавочнае трызненне? Спачатку не паверылі, аднак калі справа зайшла занадта далёка, позна было ўжо чыніць нейкі супраціў. Аднак паколькі народ у нас відавочна не жадае лезці на ражон, звязваюцца з уладамі, то ўсе пратэсты звяліся да заяў, публікацый, лістоў на Захад, арганізацыі «круглых сталоў» і серыі флэшмобаў, якіх органы не далі правесці. Па вопыту можна казаць, што такія дзеянні не маюць вынікаў.

***— Можа, блогеры ўжо прыдумалі якія-небудзь тэхнічныя спосабы для таго, каб далей весці свае дзённікі, захаваўшы пры гэтым ананімнасць?***

— Мне здаецца, што блогерам увогуле мала цікава, што адбываецца вакол новага заканадаўства. Палітыкай у Казахстане займаецца вельмі абмежаванае кола людзей, прычым імі выкарыстоўваюцца для гэтага не чаты, а інтэрнэт-выданні.

***— Заклятага вораг Назарбаева Рахат Аліеў, каментуючы закон, піша на сваім блогу, што наступным крокам будзе поўная забарона інтэрнэта ў Казахстане. Наколькі гэта верагодна?***

— Наўрад ці справа дойдзе да гэтага. Хутчэй за ўсё, улады ўсё пралічылі на два крокі наперад. Пэўныя праблемы прыносяць дзяржаве апазіцыйныя сайты, аднак іх не так шмат. Так што пры жаданні зачыніць або заблакаваць іх будзе не цяжка. А далей уступаюць у дзеянне новыя папраўкі, якія перасякуць спробы апазіцыі сысці ў блогасферу. І доступ у інтэрнэт пры гэтым можна не перакрываць.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ФІДЭЛЬ КАСТРА



Былы кіраўнік Кубы, нягледзячы на жорсткі ложкавы рэжым, працягвае ўплываць на знешнюю палітыку краіны з дапамогай звычайнай асадкі. Кожны дзень ён піша нататкі для ўласнай калонкі ў газеце кампартыі. Матэрыялы калонкі часта выклікаюць скандалы, паколькі фактычна лічацца заявамі кубінскага МЗС. Апошні скандал звязаны са «свіным грыпам». Фідэль Кастра напісаў, што мексіканскія ўлады даўно ведалі пра H1N1, аднак хавалі праўду, каб не сарваць візіт Барака Абамы, які наведаў краіну ў сярэдзіне красавіка. Менавіта пасля заканчэння візіту з'явілася афіцыйная інфармацыя пра пачатак эпідэміі. Заяву Кастра ўжо пракаментавалі мексіканскія ўлады. Яны рашуча пратэстуюць, спасылаючыся на тое, што сітуацыю ў краіне кантралююць не чыноўнікі, а Сусветная арганізацыя аховы здароў. Палітолагі не выключаюць, што інсінуацыі Кастра могуць прывесці да дыпламатычнага скандалу. У прынцыпе, напісанае можна лічыць рэакцыяй на навіну пра тое, што ў Кубе зарэгістраваны першы хворы на «свіны грып». Гэта мексіканскі студэнт, які вучыцца ў адным з правінцыйных гарадоў Кубы. Медыцынская сістэма — галоўны канёк кубінскай афіцыйнай прапаганды, і калі краіна не справіцца з вірусам, міф пра самую лепшую медычную дапамогу можа быць пахаваны, а разам з ім — і пазітыўны імідж рэжыму.

### ІСЛАМ КАРЫМАЎ



Прэзідэнт Узбекістана рыхтуецца да ўзбекскіх Дажынак. Уся сталіца краіны перакопаная, ідуць будоўлі, кладуцца новыя трасы, садзяцца дрэвы. У гэтым годзе Дзень гораду будзе асаблівы. Прэзідэнт Карымаў лічыць, што менавіта ў 2009-м гораду споўніцца 2000 гадоў. Гэта лічба асаблівая цікавая з улікам таго, што толькі пяць гадоў таму горад ужо святкаваў 2000-ы юбілей. Аднак уладу гэта мала турбуе, тым больш, што лаяльныя гісторыкі дэманструюць журналістам нейкія археалагічныя доказы. Ніхто дакладна не ведае, калі сапраўды быў заснаваны горад, аднак яго жыхарам з нагоды той гадавіны даводзіцца цярпець. У прыватнасці, у Ташкенце забаранілі сушыць бялізну на балконах па прычыне таго, што… гэта не адпавядае нацыянальным традыцыям. Вiноўнікаў чакае спачатку папярэджанне, потым штраф, і нарэшце — прымусовае высяленне з дому праз суд. Пра тое, што бялізна — гэта не жартачкі, сведчаць маштабы міліцэйскай акцыі: цяпер міліцыянеры абходзяць дамы і інструктуюць жыхароў наконт новага закону. Цяжка сказаць пра сапраўдныя прычыны кампаніі супраць бялізны на балконах. Аднак варта будзе згадаць, што пару гадоў таму па асабістаму патрабаванню Карымава ў краіне быў забаронены більярд.

### ПЁТР ФАРФАЛ

Кіраўнік польскага нацыянальнага тэлебачання *(TVP)* даўно ўжо стаў заклятым ворагам ліберальных і левых польскіх медыя: ён пачынаў сваю кар'еру як неанацыст, а пасля сышоў у партыю правых кансерватараў, і нарэшце апынуўся ў крэсле дырэктара *TVP*. З гэтай пасады яго ўжо неаднаразова спрабавалі скінуць. Напрыклад, працаўнікі Фарфала развярнулі кампанію супраць рашэння *TVP* не трансляваць канцэрт у падтрымку дэмакратыі ў Беларусі. Аднак Пётр насуперак усім намаганням сваіх ворагаў пасаду не пакінуў. Усё дзякуючы пазіцыі левых і лібералаў, якія не жадаюць, каб *TVP* узначаліў прадстаўнік партыі прэзідэнта. І вось новая газетная атака на Фарфала. У цэнтры кампаніі, якую распачала *«Gazeta Wyborcha»*, яўныя сімпатыі *TVP* да адной з партый, якая ўдзельнічае ў выбарах у Еўрапарламент. Размова пра партыю *«Libertas»*, што выступае супраць Канстытуцыі ЕС. Пры не толькі займае першае месца ў выбарчым спісе *«Libertas»*, ён актыўна рэкламуе партыю, выкарыстоўваючы рэсурсы *TVP*. Па сутнасці маргінальная партыя згадваецца ў навінах на тым жа ўзроўні, як урадавыя і парламенцкія партыі. Трэба дадаць, што левым і лібералам выгодны раскол на правым флангу. А менавіта гэтым зараз фактычна займаецца цяперашні дырэктар *TVP*.



▸ **НОВАЯ ГЕНЕРАЦЫЯ**

# ЛОНДАН—МІНСК—БАБРУЙСК, ЗНОЎ ЛОНДАН

Марыя МАРТЫСЕВІЧ

**Камера папярэдняга зняволення, у якой яго трымалі да суда, была памерам не больш за памяшканне бара «Лондан». Ён кажа гэта, бо прыходзіцца да слова: мы размаўляем у бары «Лондан» — наймініяцюрнейшай з усіх модных кафэшак Мінска. Але гэта здаецца мне ці не самым значным з усяго, прамоўленага ім за вечар. Важна тое, што тут Андрэй Кім знаходзіцца па сваёй волі — гэта ён абіраў месца, дзе мы сустрэнемся. Любоў да «Лондана» і «лонданцаў» — адна з тых рэчаў, якая, нягледзячы ні на што, не змянілася. Прыходзіць сюды — азначае для яго вяртацца на месца «былых злачынстваў»: пакуль не выгналі з гістфаку, ён сачкаваў тут заняткі фізкультуры.**



Андрэй Кім. 4 мая 2009

10 студзеня 2008 года грамадскі актывіст моладзевай ініцыятывы «Ініцыятыва» Андрэй Кім (1986 года нараджэння) быў арыштаваны, а 22 сакавіка яго судзілі па абвінавачанні ў арганізацыі масавых беспарадкаў (выйшаў на мітынг прадпрымальнікаў) і супрацьпраўных дзеяннях у дачыненні да супрацоўніка міліцыі (балюча ўдарыў). Нягледзячы на відэаматэрыялы, дзе было выразна бачна, што побач з міліцыянтам быў іншы чалавек, хлопца асудзілі на паўтары гады калоніі. Увесь працэс суправаджаўся шырокім міжнародным рэзанансам і акцыямі падтрымкі — найбольш уражвала актыўнасць сяброў палітвязня, мэта якіх была падбадзёрыць таварыша ў няпростай сітуацыі, прыцягнуць увагу да яго становішча негвалтоўнымі, пацыфісцкімі сродкамі (дасылалі паштоўкі, малявалі коміксы). 20 жніўня 2008 года Кім быў вызвалены па асабістым загадзе прэзідэнта краіны. Вось, у двух словах, гісторыя таго, як яго жыццё распалавінілася на «да» і «пасля».

## Да: «Чырвоная шапачка»

Адзін з самых папулярных напояў у бары «Лондан» — гарачы парэчкавы кампот з цукатамі пад назвай «Чырвоная шапачка». Салодкае пітво для легкадумных дзяўчатак, якія і ўявіць не могуць, што неўзабаве спаткаюцца з воўкам. Хачу выбраць яго, але вагаюся — прыемнае хваляванне перад меню, знаёмае яшчэ са старэйшых класаў школы. Мае аднакашнікі падзяляліся на тых, хто сачкаваў фізру ў курылцы, тых, хто сачкаваў фізру ў летняй кафэшцы ля ўніверсаму, і тых, хто фізру ўвогуле не сачкаваў, а зацята ганяў у футбол і на «выдатна» здаваў нарматывы. Асабіста я ўваходзіла ў групу нумар два, і ў гэтым Андрэй Кім мне, безумоўна, блізкі.

Але ўсё адно гэты герой даецца мне цяжэй за іншых. Найперш таму, што спачатку мне было не да канца ясна, пра што тут можна пісаць. Чаму менавіта Андрэй Кім і пры чым тут партрэт пакалення. У Мінску ёсць безліч такіх сама субтыльна-інтэлігентных хлопцаў, заўсёднікаў багемных кавярань, якія ведаюць меню напамяць і сябруюць з афіцыянтамі. Абаяльных, разумных, начытаных суразмоўцаў. Чаму мне не падысці да любога з іх? У той жа час, у беларускіх турмах адбывалі, адбываюць і яшчэ будуць адбываць зняволенне безліч маладых беларусаў. Сярод іх, на жаль, і «палітычныя»… Ключ я знайшла вось дзе: у маім разуменні гэтыя дзве іпастасі — «зэка» і «багемы» — не могуць спалучацца ў адным чалавеку.

Нягледзячы на тое, што мне цяжка было ўявіць майго знаёмага Андрэя Кіма за кратамі, інфармацыя пра тое, што яго арыштавалі па такім сур'ёзным абвінавачванні, не выклікала ў мяне асаблівага здзіўлення. Да гэтай падзеі Андрэй Кім уяўляў сабой сумесь некалькіх тыпажоў: грамадскі актывіст, аматар інтэлектуальных гульняў, студэнт-гісторык і фанат літаратуры фэнтэзі. Ён меў даўгія валасы, стужачку ў іх, значкі на заплечніку і адначасова тры ідэі ў галаве. Усе тры ідэі ён імкнуўся вокамгненна ажыццявіць, мала думаючы пра метады і наступствы. Здавалася, ён займаўся адначасова ўсім — і не рабіў нічога. І пры гэтым прамяніўся пазітывам і паўсюль меў сяброў, знаёмых і проста людзей, што добра да яго ставіліся.

Безадносна канкрэтных лёсаў маіх аднакашнікаў, тры магчымыя спосабы сачкаваць фізкультуру ў маёй школе здаюцца мне тымі трыма шляхамі, па якіх светапоглядна разыходзіцца беларуская моладзь, калі надыходзіць час прымаць самастойныя рашэнні. Можна, канешне, дэманізаваўшы, як гэта ў нашай інтэлігенцыі водзіцца, уладныя і сілавыя структуры, высунуць меркаванне, што рэжым пабачыў у Андрэі Кіме аднаго з (чатырнаццаці) патэнцыйных лідэраў маладой апазіцыі, і палічыў за лепшае яго нейтралізаваць. Але мне больш верагоднай здаецца іншая версія. Ім — ну, тым, хто са спортзалі, — проста не спадабаўся валасаты пацан у акулярах, і яны запяклі яго да тых, хто з курылкі.

## Там: чыфір

На Валадарцы і на зоне ў Бабруйску яму сустракаліся «вельмі цікавыя людзі». І вельмі розныя: дырэктары прадпрыемстваў, чыноўнікі, скінхэды і нават «пляменнік Ядвігі Паплаўскай». Наркаманы, хабарнікі і стукачы — частае насельніцтва беларускіх СІЗА. У камеры памерам з «Лондан» было сапраўды цяжка: людзей як селядцоў у бочцы, сядзець 24 гадзіны даводзілася ў прамым, а не пераносным сэнсе, а спаць — па чарзе. Пасля суду і пераводу ў бабруйскую калонію дыхаць стала прасторней, але пачаліся асаблівасці існавання асуджанага зэка. «Артыкул у мяне быў паважаны, да таго ж на міжнародным узроўні мяне прызналі палітвязнем. Да такіх на зоне ставяцца нават больш чым нармальна. Зэкі падыходзілі, цiснулі руку: Андрэй, мы з табою».

Турма больш не чорная — Андрэй эпатуе мяне і бар «Лондан» абазнанасцю ў «паняціях». На змену ўладзе крымінальных аўтарытэтаў прыйшла ўлада адміністрацыі. Тым не менш, трываць цяжкую аўру пенітэнцыярнай установы было вельмі няпроста: зэкі — азлобленыя, недаверлівы народ, які кіруецца найперш уласнай выгадай. Законы звычайнага грамадства там не дзейнічаюць. У той жа час было і чаму павучыцца: «Я з шокам даведаўся, — смяецца, — што аўтарытэты на зоне не чыфіраць».

Нягледзячы на кепскі зрок і праблему з вачыма, праз якую давялося ляжаць у турэмнай «бальнічцы», увесь час зняволення Андрэй Кім перакладаў кнігу ўлюбёнага пісьменніка — першую частку «Хронік Нарніі» Клайва Стэйлза Льюіса. Пераклад — амаль цалкам зроблены чарнавік кнігі — на жаль, на волю забраць не ўдалося. Але сама постаць Льюіса — фактычна ключавая ва ўсім, што адбывалася.

Андрэй Кім зачытваўся Льюісам з дзяцінства. Пісьменнік гэты варты кананізацыі ўсімі хрысціянскімі канфесіямі адначасова. У прыдуманай ім казачнай краіне Нарнія, населенай чараўнікамі і жывёламі, што гавораць, мае месца бітва паміж Дабром і Злом — праз біблейскія ідэі, уплеценыя ў свае кнігі, праз хрысціянскія каштоўнасці, ім прапагандаваныя, Льюіс прывёў да веры неверагодную колькасць моладзі па ўсім свеце. Менавіта да веры і разумення Бога, а не ў царкву: царкву кожны потым абіраў сабе сам, адпаведна тым ці іншым перакананням. Асабліва актуальным у гэтым плане Льюіс стаўся ў атэістычным грамадстве былога СССР, з яго «ненамоленым» пакаленнем 1980-х, дзецьмі бацькоў, а то і ўнукамі дзядуль-бабуль атэістаў.

Кім — пратэстант, але ў калоніі ён скарыстоўваў кожную магчымасць пабыць у турэмнай праваслаўнай царкве — яго ратавала сама атмасфера храму. «Бацюшка, калі мяне спавядаў, сказаў: у табе няма граху», — Кім кажа пра гэта з гонарам, як пра адно з найважнейшых дасягненняў у жыцці. На мітынгі, да грамадскіх пратэстаў яго прывяло пачуццё несправядлівасці, асабліва вострае ў вернікаў-хрысціянаў.

Вызвалялі Кіма гэтак жа нечакана, як асуджалі, — хоць звычайна такая працэдура займае цэлы дзень. Далі на зборы сем хвілінаў і выставілі за браму.

## Пасля: «Цюлень»

З турмы 22-гадовы Андрэй Кім выйшаў старым. Прынамсі, гэтак ён адчувае. За тры гады, што прайшлі з сакавіка 2006-га, ён змяніўся амаль непазнавальна. Я найперш пра ўнутраны свет. Мудрасць — гэта замоцна сказана, але хлопец паспакайнеў. Зразумеў, што «торгацца ў розныя бакі не мае сэнсу».

Кім — прозвішча па кудзелі. Маці Андрэя з аднаго боку паходзіць з сям'і рускага праваслаўнага духавенства і з роду карэйскага вайскоўца на расійскай службе — з іншага. Андрэй расказвае, у чым, на яго погляд, іншасць культуры і выхавання яго маці ў параўнанні з тутэйшай. Чарговае збіццё чалавека на вуліцы, мітынгу, незаконныя арышты шакуюць яе кожны раз наноў: «Яна не можа прызвычаіцца да несправядлівасці. Я, як многія беларусы (і ў гэтым наша праблема), успрымаю гэта больш млява і абыякава, нават — як дадзенае».

На маё ідыёцкае пытанне: «Кім Кі Дук ці Кім Чэн Ір?» — Андрэй Кім адказвае так: «Я лічу, кожны з нас мае патэнцыял і магчымасці правадыра нацыі. Іншая справа, ці хопіць у нас сілы волі і сумлення ад гэтага адмовіцца. Я вось адмовіўся».

А Кім Кі Дук… так, яму неверагодна блізкія фільмы выдатнага карэйскага рэжысёра — квінтэсенцыя будысцкага спакою і фірмовай азіяцкай рэзкасці і жорсткасці. «З зоны я вынес жорсткасць, агрэсіўнасць і злобу. Інакш там нельга — кожную хвіліну даводзіцца адстойваць сваю годнасць і сцвярджаць сваё месца ў тым соцыуме. Мая задача — пазбаўляцца ад усяго гэтага. Гэтага ад мяне вымагае вера. Хрысціянства, мараль маюць галоўнае значэнне ў маім жыццёвым выбары. Таму я не з'ехаў вучыцца за мяжу ці на заробкі ў Маскву. Калісьці я марыў стаць місіянерам і паехаць у Афрыку, але потым зразумеў, што нельга нікуды выпраўляцца: місіянеры патрэбныя Беларусі». Па словах Андрэя, яго жыццё, калі зірнуць з боку, — гэта параза за паразай: выключэнне з універу, адсідка і беспрацоўе пасля вызвалення. Але паколькі тыя крокі, што ён зрабіў, дыктуюць яму тыя перакананні, якія ён лічыць правільнымі, у суме гэта можна лічыць шляхам да перамогі. Прынамсі, яго асабістай.

З гістфаку «за палітыку» Андрэй Кім паляцеў даўным-даўно, але не шкадуе, бо адчувае: гісторыя — гэта не ягонае. Як, зрэшты, і палітыка, за якую паляцеў. Анягож, чалавеку з такімі разнастайнымі цікаўнасцямі мусіла б падысці нешта інтэрдысцыплінарнае. З усяго, чым яму было б цікава займацца ў будучыні, ён абраў дыстанцыйнае навучанне ў ЕГУ па спецыяльнасці медыі і камунікацыі. Найперш яго цікавіць рэклама: «Радзіме патрэбныя піяршчыкі». З усіх магчымых стратэгій грамадскай дзейнасці абраў кампенсаторную. Моладзі не хапае прыгожых паштовак, каб віншаваць адзін аднаго з беларускімі святамі (той жа Дзень Волі) або з усімі іншымі святамі па-беларуску.

А яшчэ беларусам бракуе добрага настрою і ўсмешак, лічыць Андрэй, і таму штогод яны з сябрамі купляюць кветкі і выходзяць дарыць іх незнаёмым людзям на вуліцу. «Крэатыў і, галоўнае, — дапамагаць людзям, — так ён акрэслівае свае планы на будучыню. — Я, можа, міліцыянтам бы стаў, калі б не такая краіна». У «Лондане» ён замовіў свой любімы напой «Цюлень» — лімонны, з міндалем і кіслінкай, каб прыемней было піць няспешліва і думаць.

З НАГОДЫ

# ПАМЯЦІ ВІТАЛЯ ЦВІРКІ

Аляксей ХАДЫКА

**Вялікая экспазіцыя пейзажаў і нацюрмортаў класіка беларускага жывапісу другой паловы XX стагоддзя Віталя Канстанцінавіча Цвіркі (1913–1993) працуе ў мінскім Палацы мастацтваў да 31 мая 2009 года. У залі на другім паверсе з фондаў Беларускага саюзу мастакоў з калекцыі сям'і патрыярха беларускага жывапісу прадстаўлена некалькі дзесяткаў выдатных твораў, многія з якіх доўгія гады былі не даступныя аматарам прыгожага.**




Падзея, якую не варта прамінуць, бо творчасць Цвіркі — як ланцужок, што звязаў найбольш значныя моманты мастацкага жыцця краіны. Ад Віцебскай школы (у 1929–1932 гадах Цвірка вучыўся ў Віцебскім мастацкім тэхнікуме ў І. Ахрэмчыка, Ул. Хрусталёва) да ўзнікнення паўнавартаснай сістэмы мастацкай адукацыі ў сталіцы. Віталь Канстанцінавіч з 1953 года выкладаў, а затым і ачольваў кафедру жывапісу ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце, а ў 1958–1960 гадах быў яго рэктарам.

Варта таксама адзначыць, што талент Віталя Цвіркі выявіў яшчэ ў мінскай школе (пасля пераезду сям'і яго бацькі, гомельскага настаўніка, у сталіцу) выдатны мастак, які не грэбаваў выкладаннем у звычайных навучальных установах — Міхаіл Станюта. А таксама заўважыў сусед па доме, Кандрат Крапіва, якому апрача літаратурнага быў не чужы і дар малявання. І магчыма, пазнейшы ад'езд на вучобу ў Маскоўскі дзяржаўны мастацкі інстытут (1935–1942), дзе Цвірка навучаўся ў Г. Ражскага, П. Пакаржэўскага і С. Герасімава, не толькі ўдасканаліў яго жывапісны талент, але і выратаваў жыццё. У Маскве рэпрэсіі супраць інтэлігенцыі на фоне сітуацыі ў Мінску канца 1930-х былі зусім сціплымі.

Вядома, што Цвірка, выканаўшы для Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны серыю мемарыяльных партрэтаў, да жанру партрэта ўвогуле звяртаўся рэдка, застаючыся найперш мастакомпейзажыстам. Мемарыялізацыя савецкай гісторыі магла добра падкарміць творцу ў тыя часы, але гэты выбар мастака свядома не задавальняў. Дэкларатыўнапатрыятычным кампазіцыям была аддадзена толькі сімвалічная даніна: хіба што «Палонных вядуць» (1945) ды «Паўстанне рыбакоў на возеры Нарач» (1957). Але тых палотнаў на выставе няма. Затое ў яго творчасці спакваля, але настойліва выяўляліся іншыя, вечныя тэмы.



Аматары беларускай даўніны памятаюць выставу іканапісных абразоў XVI–XVIII стагоддзяў з калекцыі Віталя Канстанцінавіча, якая прайшла ў сярэдзіне 1990-х у Нацыянальным мастацкім музеі. Цягам сваіх вандровак па краіне, малюючы краявіды, цэнтральнай дамінантай на якіх вельмі часта рабіліся храмы, мастак, калі мог, ратаваў старадаўнія шэдэўры з зачыненых святыняў. Падобна свечкам, узносяцца на яго палотнах то над заснежанымі прасторамі, то ў тонкай атмасферы восеньскай ці веснавой прыроды — мастак захапляўся пераходнымі станамі пораў года і часу сутак — купалы і званіцы цэркваў.

Настрой такіх палотнаў часцей задуменны, медытатыўны; як радкі нетаропкай малітвы пакладзены на палатно шырокія, спакойныя мазкі тонка згарманізаваных фарбаў. Як акорды музычнай кампазіцыі — вялікія плямы дамінуючых колераў, як дробныя дадатковыя акцэнты — рытмы лёгкіх, свабодна накрэсленых па паверхні палатна ўзораў дрэў і галінак, часам пазначаных адным-двума рухамі пэндзля постацей людзей.

Краявіды — ад звычайных лепельскіх пагоркаў, на якіх простыя рыбакі раскідалі сушыцца свае сеткі, да знакавых купалаўскай Вязынкі, коласаўскай Мікалаеўшчыны, нёманскіх берагоў з абрысамі Каложскай царквы. Зварот да жанру нацюрморта ў 80–90-я гады мінулага стагоддзя — своеасаблівы апафеоз тэхнічнай свабоды ў творчасці мастака, калі пэндзаль атрымлівае максімальную лёгкасць, а колеры кветак, садавіны, гародніны сваёй яскравай шчырасцю спрачаюцца з першапачатковай фактурай прадметаў. Але і ў шэрагу нацюрмортаў, як напамін пра вечнае, — кампазіцыя з Укрыжаваннем.

Выпрацаваўшы свой стыль, Цвірка нікому са сваіх вучняў (а сярод іх ці не ўсе пейзажысты Беларусі цяперашняга старэйшага пакалення, ад М. Казакевіча да Л. Шчамялёва) яго не навязваў. Невыпадкова Л. Шчамялёў, гаворачы пра Цвірку, звычайна падкрэслівае, што той падтрымаў яго ў «няпростых пошуках мастакоўскага «я».

А на заканчэнне — некалькі заўваг пра асаблівасці нацыянальнай памяці ў Беларусі. Здавалася, яшчэ ў 1996 годзе выйшла пастанова прэм'ера краіны С. Лінга пра ўшанаванне Віталя Цвіркі, мемарыяльная дошка ў яго гонар з'явілася на вуліцы Валадарскага, 21, ужо тры гады пад куратарствам старшыні міжнароднай гільдыі жывапісцаў Ф. Ястраба адбываюцца Міжнародныя фестывалі пейзажу ў гонар Цвіркі з выставамі ў Нацыянальнай бібліятэцы. Але варты лепшага стан работ мастака на бягучай экспазіцыі ў Палацы мастацтваў (шэраг палотнаў патрабуе рэстаўрацыі) нагадаў пра агульную праблему захавання якасных мастацкіх твораў, якія належаць дзяржаве. Ці вартыя карціны Цвіркі ўпрыгожваць калідоры аднаго з гатэляў у ваколіцах Мінска або быць схаванымі ў рэжымнай Беларускай ваеннай акадэміі? Ёсць пра што паклапаціцца — да стагоддзя мастака засталося менш за 4 гады.

Зварот да жанру нацюрморта ў 80–90-я гады мінулага стагоддзя — своеасаблівы апафеоз тэхнічнай свабоды ў творчасці мастака, калі пэндзаль атрымлівае максімальную лёгкасць, а колеры кветак, садавіны, гародніны сваёй яскравай шчырасцю спрачаюцца з першапачатковай фактурай прадметаў. Але і ў шэрагу нацюрмортаў, як напамін пра вечнае, — кампазіцыя з Укрыжаваннем

## ВЫСТАВЫ

### КАВА-АРТ

**У сталічнай кавярні «Амата кава» ўпершыню ў Беларусі праходзіць выстава карцін, напісаных эспрэса.**

У экспазіцыі 10 работ, створаных на акварэльнай паперы з дапамогай натуральнай кавы ў тэхніцы «кава-арт». У асноўным на іх намаляваны гістарычныя славутасці Італіі, фантазіі на тэму карцін старых італьянскіх майстроў.

Як зазначыў на прэзентацыі экспазіцыі 12 мая мастак Андрэй Осіпаў, кававая палітра — ад светла-жоўтага да цёмна-карычневага — добра падыходзіць для стварэння эфекту даўніны. Акрамя таго, паколькі «Амата» з'яўляецца італьянскай кавай, «часцінка гэтай краіны» стварае ў кавярні патрэбную атмасферу. Паводле слоў Осіпава, наведвальнікі могуць не толькі паглядзець карціны, але панюхаць і нават паспрабаваць іх на смак.

Паводле слоў мастака, тэхніка стварэння мастацкіх твораў з дапамогай кавы з'явілася ў 1990-х гадах у Тайландзе і Індыі. Сёння ў гэтай тэхніцы працуюць тысячы мастакоў. Сюжэты іх твораў разнастайныя: аўтапартрэты, алюзіі на тэму палотнаў сусветных жывапісцаў, партрэты, пейзажы, нацюрморты, абстракцыі, а таксама замалёўкі, скетчы, віншавальныя паштоўкі. У Беларусі гэты кірунак толькі пачынае развівацца.

Выстава ў Мінску будзе працаваць да 14 чэрвеня. Усе, хто пажадае, таксама могуць набыць карціны ў тэхніцы «кава-арт». Аднак спецыялісты папярэджваюць, што гэтыя творы мастацтва захоўваюцца толькі некалькі гадоў.

Як паведаміла кіраўнік сеткай кавярняў «Амата кава» Марына Васкрасенская, у межах экспазіцыі кожны можа адкрыць для сябе яшчэ адзін від кававага мастацтва — «латэ-арт», або стварэнне малюнкаў на паверхні кавы.

### СЛУЦКІЯ ПАЯСЫ І ГЖЭЛЬ

**У Нацыянальным музеі гісторыі і культуры 30 чэрвеня адкрыецца выстава з фондаў Смаленскага гісторыка-культурнага музея-запаведніка, прысвечаная 65-годдзю вызвалення Беларусі.**

Як паведаміў 12 мая на прэс-канферэнцыі ў Мінску дырэктар НМГК Сяргей Вечар, у экспазіцыю ўключаны 65 твораў, у тым ліку жывапісныя палотны, вырабы з золата і серабра, слуцкія паясы, гжэльскі фарфор і народныя касцюмы жыхароў Смаленскай вобласці. Усе гэтыя рэліквіі ў гады другой сусветнай вайны былі вывезены ў Германію, а затым вярнуліся ў Расію.

15 ліпеня ў НМГК адкрыецца выстава «Магдэбургскае права як люстэрка Еўропы», прысвечаная 510-годдзю атрымання Мінскам Магдэбургскага права. У экспазіцыю ўключаны як матэрыялы музеяў Магдэбурга — сталіцы федэральнай зямлі Саксонія-Ангальт (Германія), так і рэліквіі з НМГК.

На прэс-канферэнцыі, прысвечанай Міжнароднаму дню музеяў, сваімі найбліжэйшымі планамі падзяліліся таксама прадстаўнікі іншых музеяў краіны.

Дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Уладзімір Пракапцоў паведаміў, што 1 ліпеня ў музеі адкрыецца выстава, на якой будуць паказаны экспанаты з фондаў мастацкага музея і Музея на Паклоннай гары (Масква). Выстава таксама прысвечана 65-годдзю вызвалення Беларусі. У планах — выставы французскага імпрэсіянізму, беларускага мастака Барыса Заборава, які цяпер жыве ў Парыжы, а таксама абменныя выставы з парыжскім Луўрам.

Паводле слоў дырэктара Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Сяргея Азаронка, 9 мая 2010 года ў музеі адкрылася беларуска-расійска-ўкраінская выстава «Парад Перамогі». Пры ўдзеле супрацоўнікаў музея ствараюцца экспазіцыі «Старая мяжа» і «Партызанскі лагер» у агракамбінаце «Дзяржынскі» ў Дзяржынскім раёне Мінскай вобласці, а таксама музей авіяцыі ў Нацыянальным аэраклубе ў Баравой (Мінск).

**Паводле БелаПАН**

### КНІГІ БЫКАВА – ВІЦЕБСКІМ БІБЛІЯТЭКАМ

**Сёмы і восьмы тамы збору твораў Васіля Быкава ў бібліятэкі 14 мая перадалі актывісты абласной рады ТБМ, літаратары — прадстаўнікі недзяржаўнага СБП і Ірына Міхайлаўна Быкава, удава знакамітага пісьменніка-земляка.**




Акцыя пад лозунгам «Кнігі Быкава — віцебскім бібліятэкам» распачалася з ініцыятывы мясцовага ТБМ некалькі гадоў таму, як толькі пачаў выдавацца апошні поўны збор твораў пісьменніка. Перш чым перадаць чарговыя два тамы, удзельнікі акцыі вырашылі ўскласці кветкі да мемарыяльнай дошкі ў гонар Васіля Быкава, якая з'явілася на будынку віцебскай мастацкай вучэльні 25 верасня мінулага года. Спадарыню Ірыну, удаву пісьменніка, гарадскія ўлады на адкрыццё мэмарыяльнай дошкі тады не запрасілі, і твор скульптараў Аляксандра Гвоздзікава і Валерыя Магучага яна ўбачыла ўпершыню.

Увечары Ірына Міхайлаўна і сябры СПБ сустрэліся з жыхарамі гораду ў «Еўрапейскім клубе», адчыненым для правядзення падобных імпрэзаў віцебскімі актывістамі руху «За свабоду».

**Паводле радыё «Свабода»**

▸ АБ’ЯВА

# ДНІ КУЛЬТУРЫ ШВЕЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ



З 20 мая па 17 чэрвеня 2009 года пасольства Швецыі ў Мінску пры падтрымцы Шведскага інстытута і Дзяржаўнага савета культуры Швецыі, сумесна з беларускімі партнёрамі — Міністэрствам культуры РБ, Беларускай дзяржаўнай філармоніяй, кінатэатрам «Цэнтральны», Магілёўскім дзяржаўным прадпрыемствам «Кінавідэапракат», Тэатрам-студыяй імя Е. Міровіча, Гарадскім домам культуры (Пінск), Палескім драматычным тэатрам (Пінск), Баранавіцкай гарадской цэнтральнай бібліятэкай імя В. П. Таўлая — ужо ў восьмы раз праводзяць традыцыйныя Дні культуры Швецыі, прысвечаныя Нацыянальнаму Дню Швецыі (Дню Шведскага сцяга).

Сёлета культурныя мерапрыемствы пройдуць у трох напрамках: літаратура, музыка і кіно.

Праграму шведска-беларускіх літаратурных дзён адкрывае прэзентацыя першай беларускамоўнай кнігі вядомага мастака, паэта, драматурга, празаіка, журналіста і перакладчыка Дзмітрыя Плакса «Трыццаць тэкстаў».

Акрамя таго, у рамках мерапрыемства пройдуць літаратурна-музычныя вечарыны ў Мінску і Пінску, конкурс юнацкай паэзіі ў Пінску, літаратурная сустрэча ў Баранавічах, у якіх прымуць удзел сучасныя шведскія і беларускія пісьменнікі і паэты Мікаэль Ніэмі, Валерыя Кустава, Петэр Фроберг Ідлінг, Улінэ Сціг, Аніка Нурлін, Андрэас Матсан, Людміла Рублеўская, Дзмітры Плакс, а таксама Анатоль Вярцінскі, Андрэй Хадановіч і Алесь Разанаў.

## МЕРАПРЫЕМСТВЫ ПРОЙДУЦЬ:

**20 мая. 19:00.** Прэзентацыя кнігі Дзмітрыя Плакса «Трыццаць тэкстаў»: Мінск, Літаратурны музей Максіма Багдановіча (вул. Багдановіча, 7а).

**21 мая. 18:30.** Літаратурна-музычная вечарына: Мінск, Тэатр-студыя імя Е. Міровіча (праспект Незалежнасці, 81). Вядучы — Андрэй Хадановіч.

**22 мая. 10:30.** Літаратурная сустрэча: Баранавічы, Баранавіцкая цэнтральная гарадская бібліятэка імя В. П. Таўлая (вул. Леніна, 51, 53).

**22 мая.** Конкурс юнацкай паэзіі (1-ы тур) у 17:30 і літаратурна-музычная вечарына ў 18:30. Пінск, Гарадскі дом культуры (пл. Леніна, 7).

**23 мая.** Конкурс юнацкай паэзіі (2-і тур) у 17:30 і літаратурна-музычная вечарына ў 18:30. Пінск, Палескі драматычны тэатр (вул. В. Харужай, 10).

Музычная частка Дзён культуры Швецыі прапануе канцэрт зоркі скандынаўскага фры-джаза, саксафаніста Матса Густафсана, які адбудзецца 5 чэрвеня 2009 года ў 19:00 у Вялікай зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі (праспект Незалежнасці, 50). У канцэрце таксама прыме ўдзел вядомы беларускі джазавы саксафаніст Павел Аракелян і гурт *«The Outsiders»*.

**З 8 па 17 чэрвеня** ў Мінску і Магілёве пройдзе фестываль сучаснага шведскага кіно. У рамках кінафестывалю беларускія кінааматары змогуць убачыць чатыры мастацкія фільмы.

**8 чэрвеня ў 19:00.** Мінск, кінатэатр «Цэнтральны» (праспект Незалежнасці, 13). «Вечныя імгненні Марыі Ларсан» (драма класіка сусветнага кінематографа рэжысёра Яна Труэля). На дэманстрацыі фільма будуць прысутнічаць рэжысёр Ян Труэль і яго дачка Йохана Труэль.

**9 чэрвеня ў 19:00.** Мінск, кінатэатр «Цэнтральны», **17 чэрвеня ў 18.00**, Магілёў, кінатэатр «Ветразь» (вул. Астроўскага, 1) будзе дэманстравацца драматычная гісторыя пра мараль, чалавека і прыроду — фільм «Воўк» рэжысёра Даніэля Альфрэдсана.

**11 чэрвеня ў 19:00.** Мінск, кінатэатр «Цэнтральны»; **16 чэрвеня ў 16:00**, Магілёў, кінатэатр «Радзіма» (вул. Ленінская, 47) — драма рэжысёра Енса Ёнсана «Кароль пінг-понга».

**12 чэрвеня ў 19:00.** Мінск, кінатэатр «Цэнтральны» — меладрама рэжысёра Аміра Чамдзіна «Па найвышэйшай волі».

Інфармацыйнымі спонсарамі Дзён культуры Швецыі 2009 з’яўляюцца: Беларускі партал *Tut.by*, інтэрнэт-партал *Open.by*, газеты *«Комсомольская правда в Белоруссии»* і *«Аргументы и Факты»*, гарадскі часопіс *«Where Minsk»*, радыё *«Мелодии Века»*.

Будзем радыя вітаць Вас на Днях культуры Швецыі ў Беларусі 2009!

▸ ГАСТРОЛІ

# БЕЛАРУСКІЯ МЕЛОДЫІ НА МАЛЬЦЕ

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**Для песеннага і сужэнскага дуэта «Аляксандра і Канстанцін» вясна — пачатак напружанага гастрольнага сезону па краінах Еўропы. Так, у мінулыя гады беларускія артысты ў розныя часы прынялі ўдзел у шматлікіх музычных фестывалях, якія адбываліся ў Балгарыі *(Discovery 2006)*, Сербіі *(Sunflower 2007)* і ў Маскве на святкаванні 850-годдзя расійскай сталіцы. Вось і цяпер выканаўцы выступілі на буйным міжнародным песенным фестывалі *International Hit Song Ferstival 2009*, які адбыўся ў самым цэнтры вострава Мальта, у яго сталіцы горадзе Валета. Пра гэты фестываль я і вырашыў паразмаўляць са спевакамі.**



***— Разумею, што пасля напружаных канцэртаў і ўдзелу ў фестывалях хочацца адпачыць. Але чытачам будзе цікава даведацца, як праходзілі канцэрты беларускіх артыстаў на далёкім востраве?***

— Як правіла, — распавёў Канстанцін, — вясной і летам наша канцэртнае жыццё актывізуецца. Мы выступаем на розных канцэртных пляцоўках, у тым ліку і на міжнародных. Мы правялі на гэтым востраве амаль два тыдні. У канцэртным графіку было некалькі выступаў і інтэрв’ю на тэлеканалах Мальты. Падчас нашага знаходжання на востраве мы з радасцю даведаліся, што нашу песню «Мой Галілей» тут выдатна памятаюць, і мы пачулі шмат цёплых слоў ад прыхільнікаў «Еўрабачання». Нашы новыя песні і кліпы паступілі ў тэле- і радыёрэтацыю гэтай краіны.

***— Якія найбольш яркія ўражанні засталіся ў вашай памяці пасля ўдзелу ў фэсце International Hit Song Ferstival 2009 і знаходжання на Мальце?***

— Запрашэнне выступіць на Мальце, — адзначыла Аляксандра, — мы атрымалі некалькі гадоў таму, але рэалізаваць яго атрымалася толькі зараз. Мы выступілі на сцэне песеннага фестывалю, які сабраў артыстаў з многіх еўрапейскіх краін: Англіі, Ізраіля, Грэцыі... Канцэрт трансляваўся ў прамым эфіры мальтыйскага тэлебачання. Гэта было вельмі адказна і хвалююча. Бо мы адзіныя прадставілялі папулярную музыку нашай краіны.

Як толькі мы трапілі на тэрыторыю аэрапорта, то з’явілася ўражанне, што машына часу перанесла нас у сярэднявечча. Такой колькасці выдатна захаванай даўнейшай архітэктуры мы яшчэ не бачылі. Шматлікія старажытныя храмы прыводзіла нас у захапленне. А яшчэ мы даведаліся, што плады кактусаў, якія спеюць у жніўні, мальтыйцы з даўніх часоў ужываць у ежу, а таксама робяць з іх вельмі смачныя лікёры, якія мы з задавальненнем прадэгуставалі. А бульбы на Мальце так шмат, што частку яе мальтыйцы экспартавалі ў Галандыю.

***— Але, думаю, у дуэта ёсць даволі шмат спраў на радзіме. І яны дапоўняць ваш канцэртны графік. Дзе можна будзе беларусам пачуць вашы песні ў «жывым» выкананні?***

— Другая палова мая пройдзе ў нас у туры па гарадах Беларусі. У рамках праекта ААН «Спынім СНІД. Выканаем абяцанне», — адказаў Канстанцін. — Разам з іншымі ўдзельнікамі праекту дадзім некалькі дабрачынных канцэртаў. Акрамя гэтага, мы атрымалі запрашэнне прыняць удзел у доўгатэрміновым тэлевізійным музычным праекце адной з еўрапейскіх краін. У канцы мая будзе падрыхтаваны кантракт. Калі ўмовы акажуцца для нас прымальнымі, з задавальненнем возьмем удзел у ім.

Свіслач • Гародня • Ваўкавыск • Шчучын • Гайнаўка • Высокае • Масты • Беласток • Бельск Падляшскі • Сяматычы

98,1 FM

БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ РАЦЫЯ

www.racyja.com

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар Алена Анісім
Шэф-рэдактар Аляксей Кароль

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1798 ад 12 верасня 2008.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:** 220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214. Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 15.05.2009. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.